Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родным мове

# ЗВЯЗДА

9 ЛІСТАПАДА 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 216 (28832)



НАН БЕЛАРУСІ — 90

4

ПРАВЫ СПАЖЫЎЦА. ШТО ЗМЕНІЦЦА?



9-24 стар.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ТУРЧЫН, першы намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Мне здаецца, што самы лепшы эканамічны курс — гэта курс прадказаны і прадказальны. Для бізнесу і грамадства ў цэлым няма нічога лепшага за стабільнасць. У Беларусі створаны ўсе ўмовы для эфектыўнай работы эканомікі. Прадугледжаны і стабільнасць падатковай сістэмы, і падзел функцый уласніка і рэгулятара, і аптымізацыя сістэмы дзяржкіравання. Усе рашэнні прынятыя, трэба проста іх рэалізоўваць. Ключавым пунктам павінна стаць разуменне таго, што патэнцыял традыцыйных галін эканомікі абмежаваны. І справа не ў тым, добра ці дрэнна яны працуюць, справа ў глабальнай змене структуры сусветнай эканомікі, якая натуральным чынам закранае і нашу краіну. Таму мы робім стаўку на IT, hi-tech, менавіта таму самым сур'ёзным чынам зоймемся галоўным — чалавечым капіталам».*

# ЧАС ВАЖНЫХ РАШЭННЯЎ

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у саміце Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы**

**Маштабнае мерапрыемства сустракала Астана, сталіца Казахстана. Пасля цырымоніі прывітання і фатаграфавання кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц арганізацыі пачалася сесія Савета калектыўнай бяспекі ў вузкім складзе. Цэнтральныя пытанні сустрэчы — праблемы міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі і ўзаемадзеяння ў фармаце арганізацыі на міжнароднай арэне. Пасля адбылося пленарнае пасяджэнне, на якім удзельнікі заслухалі інфармацыю аб бягучай дзейнасці АДКБ, выкананні ранейшых рашэнняў, а таксама аб прыярытэтных кірунках дзейнасці ў наступны перыяд старшынства ў арганізацыі Кыргызстана.**

СТАР. 2



Фота БелТА.

# МУЗЕЙ ВЫХОЎВАЕ МАЙСТРОЎ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Полацкі музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я актыўна супрацоўнічае з Нацыянальным цэнтрам культур і рамёстваў старажытнага горада і рэгіянальна праводзіць майстар-класы з найлепшымі майстрамі Полаччыны. На гэтым здымку кіраўнік народнага клуба аматараў шыцця з абрэзкаў «Рошва» Ніна ЯРМУХ *(справа)* перадае сакрэты майстэрства загадчыцы музея Аксане КОЗЕЛ і вядучаму навуковаму супрацоўніку Наталлі ШЫПІЛЕ. Майстар-клас праходзіць у экспазіцыйнай зале музея ў атачэнні узораў ручнога ткацтва і традыцыйных паясоў.**

## КОРАТКА

**• Юныя хакеісты з Беларусі, Расіі, Казахстана і Латвіі 8 лістапада пачалі барацьбу на малой лядовай пляцоўцы «Чыжоўка-Арэны» за Кубак Прэзідэнцкага спартыўнага клуба.**



• Грамадзяне краін ЕАЭС з 1 студзеня 2019 года змогуць бяспошлінна ўвозіць на адзіную мытную тэрыторыю ЕАЭС тавары для асабістага карыстання на суму не большую за 500 еўра, і вага якіх не перавышае 25 кілаграмаў.

**• Белдзяржуніверсітэт увайшоў у рэйтынг найлепшых ВНУ свету THE ў катэгорыі «фізічныя навукі».**

Ёсць пытанне

# «Не меншая праблема, чым незаконны гандаль»

## Як абараніць турыстаў ад непрафесійных экскурсаводаў

**«На экскурсіі ў Будславе гіда спыталі, ці праўда, што тут ёсць нейкае свята, калі да абраза Божай Маці людзі ідуць праз касцёл на каленях. Ён са смехам: «Ну што вы, не!» А я дакладна ведаю, што гэта праўда, бо сама ўсё бачыла. Ціхенька падышла і сказала яму на вушка, што гэта за свята і якога чысла тут праходзіць, — быў вельмі незадаволены», — пакінула на форуме водгук адна з падарожніц. З некампетэнтнасцю гіда сутыкнуліся і калегі, калі са здзіўленнем пачулі, што ў XIX стагоддзі латынню ў Беларусі валодалі нават сяляне. «Звязда» вырашыла дэталёва разабрацца, хто можа працаваць экскурсаводам, як турысты быць упэўненым, што перад ім прафесіянал, ці ёсць у гэтай сферы «таемныя пакупнікі» і чаму складана пакараць тых, хто знаёміць са славутасцямі краіны без атэстацыі.**

### Экзамен завальвае амаль траціна прэтэндэнтаў

Атэстацыю экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў праводзіць Нацыянальнае агенцтва па турызме. **Намеснік дырэктара агенцтва Алена ЛІХІМОВІЧ** запэўнівае, што гэтая працэдура — не простая фармальнасць. Экзамен складаецца з двух частак. Першая — камп'ютарнае тэсціраванне. Правяраецца веданне гісторыі, геаграфіі, культуры маўлення, методыкі правядзення экскурсіі, нарматыўна-прававых актаў, звязаных з будучай прафесіяй. На тэсціраванне выдзяляецца гадзіна: за гэты час з 70 пытанняў трэба правільна адказаць мінімум на 60 працэнтаў. Другі этап — абарона тэксту экскурсіі перад камісіяй. Спецыялісты задаюць прэтэндэнту пытанні, у тым ліку і агульныя, бо пры рабоце з турыстычнай групай трэба быць гатовым да ўсяго.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# ЧАС ВАЖНЫХ РАШЭННЯЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Напярэдадні абмеркавання пытанняў на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў у першай палове дня 8 лістапада ў Палацы Незалежнасці прайшло сумеснае пасяджэнне Савета міністраў замежных спраў, Савета міністраў абароны і Камітэта сакратароў саветаў бяспекі АДКБ.

Асноўная частка пасяджэння прайшла ў закрытым фармаце. Як паведамілі ў прэс-службе МЗС Беларусі, у сваім выступленні міністр замежных спраў Уладзімір Макей прадставіў пазіцыю нашай краіны па асноўных праблемах глабальнай і рэгіянальнай бяспекі, падкрэсліў важнасць калектыўных дзеянняў для вырашэння задач, якія стаяць перад арганізацыяй, выказаў прапановы па ўдасканаленні знешнепалітычнага ўзаемадзеяння дзяржаў — членаў АДКБ.

У выніку саміту ў Астане былі прыняты важныя для АДКБ рашэнні. Атрымалі прававое афармленне статусы назіральніка і партнёра арганізацыі. Кіраўнікі дзяржаў таксама прынялі рашэнне аб палажэнні аб Цэнтры крызіснага рэагавання АДКБ. Дакументам вызначаны арганізацыйныя і прававыя асновы дзейнасці гэтай структуры.

Лідары краін падпісалі дэкларацыю Савета калектыўнай бяспекі, якая з'яўляецца галоўным выніковым дакументам саміту. У ім адлюстраваны сумесныя пазіцыі кіраўнікоў дзяржаў па актуальных пытаннях міжнароднага парадку дня ў сферы бяспекі, задачы арганізацыі на наступны перыяд. Вынікам саміту таксама стала прынятыя заявы аб скаардынаваных мерах у адносінах да асоб, якія ўдзельнічалі ва ўзброеных канфліктах на баку міжнародных тэрарыстычных арганізацый.

Падпісаны рашэнні, якія датычацца пытанняў арганізацыі кіравання войскамі (калектыўнымі сіламі) АДКБ, работы Каардынацыйнага савета кіраўнікоў кампетэнтных органаў па процідзеянні незаконнаму абароту наркотыкаў, плана дзеянняў па развіцці калектыўнай сістэмы процідзеяння незаконнай міграцыі на перыяд да 2025 года і плана мерапрыемстваў па развіцці скаардынаванай інфармацыйнай палітыкі ў інтарэсах дзяржаў — членаў АДКБ. Акрамя таго, прыняты рашэнні, якія датычацца бягучай дзейнасці арганізацыі, уключаючы кадравыя, арганізацыйныя і фінансавыя аспекты.

Старшынства ў арганізацыі на наступны міжсесійны перыяд перайшло Кыргызстану. Рашэнне аб прызначэнні новага генеральнага сакратара АДКБ адкладзена да наступнай сустрэчы прэзідэнтаў, якая павінна адбыцца ў снежні ў Санкт-Пецярбургу.

**Паводле БелТА.**

Без бар'ераў

# КАБ ЖЫЦЬ ЯК УСЕ...

## Для забеспячэння роўнасці — удасканальваем законы

**Штогод у органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва па садзейнічанне ў працаўладкаванні звяртаюцца каля 4,5 тысячы грамадзян з інваліднасцю. І ад 30 % да 40 % з іх у выніку ўладкоўваюцца на працу, паведаміла кансультант упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Жанна ШЧАМЯЛЁВА.**

Прадстаўнік Мінпрацы адзначыла, што за дзевяць месяцаў гэтага года 23 чалавекі з інваліднасцю адкрылі сваю справу. Разам з тым яна лічыць, што для забеспячэння занятасці гэтай катэгорыі саіскальнікаў вельмі важна заахвочваць наймальнікаў, якія даюць ім рабочыя месцы. Формы такой падтрымкі могуць быць рознымі: дадатковае фінансаванне, кампенсацыя выдаткаў на стварэнне новых спецыялізаваных рабочых месцаў, а таксама такая праграма, як адаптацыя інвалідаў да працоўнай дзейнасці (у ходзе якой яны ўдасканальваюць прафесійныя веды і навыкі, атрымліваюць досвед працы ў калектыве). Такой адаптацыяй, дарэчы, у Беларусі займаюцца 236 прадпрыемстваў.

На будучыню прапанаваны механізм кватавання рабочых месцаў для інвалідаў, а таксама меры адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне правоў гэтай катэгорыі грамадзян, у тым ліку за ўхіленне ад забеспячэння даступнасці аб'ектаў для іх.

Гэтыя меры будуць прадугледжаны законам «Аб змяненні законаў па пытаннях сацыяльнай абароны інвалідаў», які будзе накіраваны на забеспячэнне роўнасці і паўнапраўнага ўдзелу інвалідаў у жыцці грамадства.

Зараз ідзе работа над праектам гэтага дакумента. Ён аб'ядная два асноўныя законы — «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў у Рэспубліцы Беларусь» і «Аб папярэджанні інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў». А таксама будзе дапоўнены новымі нормамі і артыкуламі, каб максімальна ўвасобіць усе палажэнні Канвенцыі аб правах інвалідаў. У прыватнасці, з'явяцца такія артыкулы, як «Недапушчальнасць дыскрымінацыі па прыкмеце інваліднасці», «Абарона правоў інвалідаў і адказнасць за парушэнне правоў інвалідаў», «Гарантыі правоў інвалідаў ва ўмовах надзвычайных сітуацый», «Асветніцка-выхаваўчая работа» (маюцца на ўвазе меры па фарміраванні ў грамадстве паважлівага стаўлення да правоў і годнасці людзей з асаблівасцямі, прыцягненні ўвагі да іх праблем).

Праектам закона прадугледжана ўвядзенне персанальнага асістэнта інваліда і ў цэлым аддаецца шмат увагі комплекснаму міждысцыплінарнаму падыходу ў рэабілітацыі. Мяркуецца забяспечыць інклюзіўную адукацыю на ўсіх узроўнях, а таксама даступнасць інфармацыі для людзей з парушэннем зроку і слыху (дзякуючы выкарыстанню перакладчыкаў мовы жэстаў, субцітраў, шрыфту Брайля, тактыльнай рэльефнай графікі, асістыўных прылад і тэхналогій). Будуць адаптаваны пад патрэбы гэтых катэгорый людзей і афіцыйныя сайты дзяржаўных органаў і іншых устаноў і арганізацый у інтэрнэце.

**Святлана БУСЬКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Дэмакраты ўзялі пад кантроль Палату прадстаўнікоў у ЗША




Кантроль над Палатай прадстаўнікоў Кангрэса ЗША ўпершыню за апошнія сем гадоў пераходзіць дэмакратам. Нэнсі Пэласі — іх лідар у палаце — павіншавала аднапартыйцаў з поспехам. «Заўтра для Амерыкі пачынаецца новы дзень», — паабяцала яна, адзначыўшы, што сістэма стрымак і процівагі зараз зможа працаваць у поўную сілу (раней рэспубліканцы кантралявалі ўвесь Кангрэс). Пасля перамогі Джэніфер Векстон над рэспубліканскім кандыдатам у Вірджыніі дэмакратам удалося адабраць у «сініх» не менш за 25 мандатаў, і зараз у іх у Палаце прадстаўнікоў большасць. А вось Сенат рэспубліканцы ўтрымалі і нават узмацнілі там свае пазіцыі. «Надзвычайны поспех сённяшнюю ноччу. Усім дзякуй!» — напісаў Дональд Трамп у сваім «Твітэры», а затым павіншаваў Нэнсі Пэласі з перамогай у Палаце прадстаўнікоў, не забыўшыся згадаць і свае поспехі: кантроль над Сенатам прэзідэнтам ЗША ўдавалася ўтрымаць толькі пяць разоў за апошнія 105 гадоў. Акцэнт на перамозе ў Сенаце робіць і іншыя прыхільнікі Трампа. І гэта істотна: імпічмент прэзідэнту, пра які кажуць дэмакраты, цяпер немагчымы. Узяўшы пад кантроль Палату прадстаўнікоў, дэмакраты змогуць блакаваць заканадаўчыя ініцыятывы Трампа і аказваць ціск на Белы дом праз профільныя камітэты Кангрэса.

## Іран папярэджвае свет аб нафтавай катастрофе

Амерыканскія санкцыі супраць Ірана прывядуць да дэстабілізацыі рынку нафты, а пакупнікоў вуглевадародаў чакаюць крызісныя часы, расказаў міністр нафты Ірана Біжан Намдар Занганэ ў інтэрв'ю агенцтву Shana. «Найбліжэйшыя месяцы, як чакаецца, будуць даволі балючымі для пакупнікоў нафты», — лічыць міністр. Зангнэ таксама ўпэўнены, што прэзідэнт Трамп, нягледзячы на «першапачатковыя баявыя крыкі», — а таксама аптымізм шэрагу рэгіянальных вытворцаў нафты, ужо разумее, што сыход Ірана з сусветнага рынку нафты прывядзе да сур'ёзнага недахопу нафты ў свеце, а ў далейшым — да крызісу. Чыноўнік лічыць, што ліквідаваць Іран з гэтага рынку немагчыма. Ён таксама ўпэўнены, што дазвол ЗША шэрагу краін працягнуць купляць нафту ў Ірана не зможа задаволіць сусветны попыт. Для палітыка таксама відавочна, што падобную гульню ЗША задумалі з мэтай «штучна знізіць цэны на нафту і бензін». Нагадаем, 5 лістапада ўступілі ў сілу амерыканскія санкцыі супраць Ірана, якія ставяць пад забарону экспартныя пастаўкі іранскай нафты. Таксама пад санкцыі падпадаюць больш за 700 банкаў, кампаній і фізічных асоб. У той жа час ЗША захавалі права закупляць нафту ў Тэгерана для Грэцыі, Індыі, Італіі, Кітая, Тайваня, Турцыі, Паўднёвай Карэі і Японіі.

## У лабавым сутыкненні аўтобусаў у Зімбабвэ загінулі 47 чалавек



Пра гэта паведаміла агенцтва Associated Press. Два міжгароднія аўтобусы, якія рухаліся ў процілеглых кірунках, сутыкнуліся на шашы непадалёк ад Русапэ, за 170 кіламетраў ад сталіцы краіны Харарэ. Аварыя адбылася з-за таго, што адзін з кіроўцаў спрабаваў абагнаць грузавік. Паводле інфармацыі газеты NewsdzeZimbabwe, сярод загінулых двое дзяцей. Шпіталізавана па меншай меры 70 чалавек.

## Кіраўніцтва абласцей на сувязі

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі па ўсёй Беларусі пройдуць у гэтую суботу, 10 лістапада. На сувязь з насельніцтвам выйдуць кіраўнікі ў рэгіёнах і Мінгарвыканкаме. Вынік такога дыялогу — аператыўнае вырашэнне надзённых пытанняў. Зрэшты, ад суботы да суботы колькасць праблемных званкоў скарачаецца.**

**Тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 правядуць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Алег Іванавіч ВЯЛІЧКА. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

старшыня МІНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Віктар Сяргеевіч ЛАПЦЕЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Супрацоўніцтва

# АД СВІСЛАЧЫ ДА ДУНАЯ

## У Венгрыі пачынае работу сумесная з Беларуссю будаўнічая кампанія

**Аб гэтым паведаміў намеснік міністра замежных спраў нашай краіны Алег Краўчанка па выніках пасяджэння беларуска-венгерскай міжурадавай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве.**

Працягнуць пазітыўныя тэндэнцыі ва ўзаемадзеянні дзвюх краін плануюць за кошт распрацоўкі новых кірункаў. Такім з'яўляецца будаўніцтва. Сумесная кампанія «Белмастбуд» створана ў ліпені гэтага года згодна з пагадненнем аб супрацоўніцтве «Белбудцэнтра» і Венгерскай будаўнічай канфедэрацыі. Новае прадпрыемства плануе выходзіць на рынак жыллёвага і прамысловага будаўніцтва ў Венгрыі.

Сур'ёзным прарывам, па словах Алега Краўчанкі, з'яўляецца завяршэнне работы над міжурадавым пагадненнем аб садзейнічанні ажыццяўленню і ўзаемаабароне інвестыцый.

— Заключэнне дадзенага пагаднення паслужыць дадатковым стымулам для пачатку рэалізацыі сумесных праектаў на тэрыторыях нашых дзяржаў, — акцэнтаваў увагу намеснік кіраўніка знешнепалітычнага ведамства Беларусі.

Па традыцыі, сумесна з пасяджэннем камісіі адбыўся беларуска-венгерскі бізнес-форум. Арганізатарамі выступілі гандлёва-прамысловыя палаты краін. Удзел у мерапрыемстве ўзялі 50 кампаній з абодвух бакоў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Занятасць

# На пошук работы — паўтара месяца

## За год афіцыйных беспрацоўных стала на 45 працэнтаў менш

**Так, на канец верасня на ўліку ў службах занятасці стаяла 15 тысяч грамадзян. А каэфіцыент напружанасці за год знізіўся з 0,5 да 0,2 беспрацоўнага на вакансію.**

Як паведамляюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, часцей без работы застаюцца мужчыны — на іх долю прыпадае 62,9 працэнта ад колькасці незанятых. Кожны пяты беспрацоўны — гэта моладзь ад 16 да 30 гадоў.

Калі год таму сярэдні перыяд пошуку работы складаў 2,1 месяца, то цяпер — 1,6. Каб уладкавацца на новае месца, мужчынам звычайна патрэбна 1,5 месяца, а жанчынам — 1,8. Сярэдняя працягласць беспрацоўя таксама за год зменшылася — з 4,1 да 3,4 месяца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

Грошы

# Час аплаціць маёмасныя падаткі

**Інспекцыя Міністэрства па падатках і зборах па горадзе Мінску нагадвае: тэрмін аплаты фізічнымі асобамі падатку на нерухомасць і плацяжоў за зямлю ў 2018 годзе — не пазней за 15 лістапада.**

Як адзначае прэс-служба гарадской інспекцыі, плацельшчык мае права датэрмінова аплаціць у бюджэт прад'яўленыя плацяжы ў поўным аб'ёме альбо выплачваць іх часткамі да надыходу ўстаноўленага заканадаўствам тэрміну. Галоўнае, аплаціць падаткі своечасова і ў поўным аб'ёме.

**Сяргей КУРКАЧ.**

З нагоды

# СУВОРАЎЦЫ АДЗНАЧЫЛІ ЮБІЛЕЙ

**Першая субота лютага даўно стала традыцыйным часам сустрэчы выпускнікоў школ і ўніверсітэтаў. Але ў тых, хто звязаў свой лёс з Суворaўскім ваенным вучылішчам, час збору — пачатак лістапада. Гэта звязана з тым, што менавіта ў апошні месяц восені далёкага 1953 года вучылішча прыняло да сябе першых навучэнцаў.**

Сярод выпускнікоў Мінскага суворaўскага вучылішча — цяперашні міністр абароны Андрэй Раўкоў, больш за 150 генералаў, мастакі, пісьменнікі. Агулам жа з яго сцен выйшла больш за 13 тысяч выхаванцаў! Многія з іх сабраліся на тэрыторыі сваёй альма-матар прыгадаць кадэцкае жыццё, сустрэцца са сваімі выкладчыкамі і прайсці па плацы страявым крокам. На гэтыя некалькі гадзін замест вайсковых прывітанняў вока чаплялі моцныя мужскія поціскі рук.

— Першым суворaўскім і нахімаўскім вучылішчам у былым СССР сёлета спаўняецца 75 гадоў, — кажа **старшыня Рэспубліканскага савета Беларускага саюза суворaўцаў і кадэтаў Сяргей ЖЫЦІХІН.** — Тады мэта ставілася адна — сабраць дзяцей вайны, не кінуць іх на волю лёсу, а згуртаваць, зрабіць з іх сапраўдных патрыётаў. Але ў Мінску суворaўскае вучылішча з'явілася толькі праз 10 гадоў. Такое рашэнне прыняло камандаванне Беларускай ваеннай акругі па просьбе Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі. У першыя наборы вучылішчаў у іншых саюзных рэспубліках, якія выпалі якраз на час вайны, прыходзілі дзеці палкоў з баявымі ордэнамі, медалямі... А ў Мінску ў вучылішча паступалі ўжо пераважна дзеці франтавікоў і партызан.

Першы набор у суворaўскае вучылішча ў Мінску быў своеасаблівы. Бралі хлопчыкаў адначасова ў розныя класы — і ў чацвёрты, і ў дзявяты... Справа ў тым, што спачатку навучанне магло доўжыцца ажно сем гадоў! Толькі праз некаторы час гэты працэс падчас рэформаў прыйшоў у стандартны выгляд. Суворaўцы пасля сталі вучыцца тры гады, а затым і ўвогуле два. Ужо ў незалежнай Беларусі тэрмін навучання ў суворaўскім вучылішчы павялічылі да пяці гадоў.


Міхаіл АКСЯНЮК з дзецьмі.
Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

— Мы мусім годна выконваць задачы, якія стаяць перад намі ў рамках Узброеных Сіл, — заўважае **начальнік Суворaўскага ваеннага вучылішча Аляксандр НАВУМЕНКА.** — Самае асноўнае — сваімі вынікамі пацвердзіць тую высокую планку, якая была пастаўлена ранейшымі пакаленнямі нашых выпускнікоў. Думаю, што ўсе задачы выканаем у поўным аб'ёме.

Міхаіл Аксянюк скончыў суворaўскае вучылішча дваццаць пяць гадоў таму. На сустрэчу ён прыйшоў з двума сынамі. Адзін з іх, Дзяніс, таксама хоча пайсці па бацькоўскіх слядах.

— Калі б машына часу перанесла мяне ў далёкі 1993 год, то я пайшоў бы след у след. Усё б рабіў гэтаксама. Мы, тагачасныя выпускнікі, дагэтуль не губляем сувязі адно з адным, нават з тымі, каго лёс закінуў у суседнія краіны. Гады, праведзеныя ў гэтых сценах, навучылі мужчынскаму сяброўству, клопату аб таварышу, хвалявацца за стан спраў у калектыве.

— Тата расказваў пра вучобу, паказваў форму, фотаздымкі, вадзіў у суворaўскае вучылішча, — кажа Дзяніс Аксянюк. — Мне вельмі спадабалася. І таму я і захацеў паступаць туды, куды і ён. Буду падцягваць фізічную падрыхтоўку і школьныя веды!

Тыя, хто паступае ў суворaўскае вучылішча, праходзяць сапраўдную загартоўку не толькі ў фізічным, але і ў маральным сэнсе. І такі ўнутраны стрыжань моцна дапамагае ім па жыцці.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Класныя навіны

# Школьны абед: і смачней, і танней

**Прадэгуставаць шэраг новых страў прапануюць мінскім школьнікам пасля заканчэння восеньскіх канікул. У перспектыве іх плануецца ўключыць у пастаяннае меню сталовых. Для правядзення даследавання вызначаны па адной-дзве школы ў кожным раёне Мінска.**


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Вучні ацэняць смак страў, іх знешнюю прывабнасць і выкажуць сваё меркаванне. Таксама ім будзе прапанавана адказаць на пытанні анкеты. Такім чынам у аддзеле грамадскага харчавання галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама хочуць вывучыць смакавыя перавагі школьнікаў, каб меню ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі было складзена з тых страў, якія дзецям падабаюцца і якія яны не будуць адмаўляцца есці.

Новае меню для школьнага харчавання распрацоўваецца з улікам сезоннасці. Так, з надыходам зімовага перыяду ў рацыён уключаць салаты, супы, гарніры з квашанай капусты і іншыя стравы.

З 1 лістапада функцыю арганізацыі харчавання вучняў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі сталіцы ўзяў на сабе Адзіны камбінат школьнага харчавання. Раней у Мінску налічвалася дзевяць раённых камбінатаў, на абслугоўванні ў якіх знаходзіўся 251 аб'ект пры ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Мяркуецца, што стварэнне адзінай структуры забяспечыць цэнтралізаваныя закупкі прадуктаў па больш нізкіх цэнах, дазволіць выключыць пасярэднікаў, удасканаліць лагістыку дастаўкі тавараў і сыравіны, адпаведна, гэта ўсё адаб'ецца і на патаненні школьнага абеду. У цяперашні час абедзенны комплекс ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі абыходзіцца бацькам у 2,3-2,5 рубля. У набор уваходзяць салата, суп, гарачае з гарнірам і напой.

Спецыялістамі галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама сумесна з камітэтам па адукацыі Мінгарвыканкама распрацаваны комплекс мерапрыемстваў, які ўключае мадэрнізацыю харчблокаў, закупку абсталявання, абнаўленне інвентару і капітальны рамонт памяшканняў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Не прапусці!

# ГЕАГРАФІЯ + ЛОГІКА І КЕМЛІВАСЦЬ

**Геаграфічная дыктоўка пройдзе ў Беларусі 11 лістапада. Удзел у ёй — бясплатны і добраахвотны.**

Арганізатарамі міжнароднай адукацыйнай акцыі ў нашай краіне выступаюць геаграфічны факультэт БДУ, Беларускае геаграфічнае таварыства пры падтрымцы Рускага геаграфічнага таварыства. Асноўная мэта — павышэнне ўзроўню геаграфічнай адукаванасці насельніцтва.

У гэтым годзе заданні будуць разлічаны на логіку, кемлівасць і нестандартнасць мыслення.

У Беларусі геаграфічная дыктоўка пройдзе другі раз. У гэтым годзе колькасць пляцовак для яе правядзення павялічыцца. Геаграфічныя веды можна будзе праверыць на геаграфічным факультэце БДУ, у Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. А. Куляшова, Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна, Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны, Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава, Мінскім філіяле Расійскага дзяржаўнага сацыяльнага ўніверсітэта, Беларуска-Расійскім універсітэце, Мінскім філіяле Расійскага эканамічнага ўніверсітэта імя Г. В. Пляханава, Расійскім цэнтры навукі і культуры (у Мінску і Брэсце). Для праходжання дыктоўкі неабходна зарэгістравацца на сайце Беларускага геаграфічнага таварыства. Вынікі выкананых работ стануць вядомыя 15 лістапада.

Упершыню «Геаграфічная дыктоўка» прайшла ў 2015 годзе ў Расіі. А ў 2017-м праект атрымаў міжнародны статус дзякуючы таму, што ў ім узялі ўдзел больш як 260 тысяч чалавек з 25 краін свету.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Надвор'е

# АД ЦЯПЛА Ў ХОЛАД

## Калі на паўднёвым захадзе плюс 12 градусаў, то на ўсходзе — каля нуля і мокры снег

**У найбліжэйшыя дні надвор'е будзе па-ранейшаму вызначаць воблaсць павышанага ціску, сфарміраваная ў вільготным паветры, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу будзе без істотных ападкаў. Месцамі туман. Тэмпература паветра ўначы па краіне складзе ад мінус 2 да плюс 5 градусаў, удзень — 3—10 цяпла. На паўднёвым захадзе краіны будзе крыху цяплей — плюс 11—12 градусаў. У нядзелю месцамі па краіне пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы, па ўсходзе краіны магчымы мокры снег і слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 5 градусаў, пры праяснениях яна панізіцца да мінус 2 градусаў. Днём сіноптыкі прагназуюць 2—9 цяпла, па паўднёвым захадзе краіны — да плюс 11 градусаў.

У нядзелю і панядзелак тэрыторыя краіны будзе знаходзіцца на перыферыі халоднага антыцыклону з цэнтрам над Сярэдняй Волгай, у паўднёва-заходніх раёнах краіны надвор'е будуць фарміраваць больш цёплыя вільготныя паветраныя масы, якія паступаюць з Заходняй Еўропы. Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі (дождж, па ўсходняй палове краіны з мокрым снегам), якія будуць суправаджацца парывістым ветрам. Уначы і раніцай месцамі захаваецца туман. Па ўсходняй палове краіны магчымы слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 1 да плюс 7 градусаў, ва ўсходніх раёнах яна панізіцца да нуля — мінус 3 градусаў. Удзень тэмпература па краіне складзе ад нуля да плюс 12 градусаў на паўднёвым захадзе краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# «РАЎБІЧЫ» ВЫХОДЗЯЦЬ НА НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ

## Спарткомплекс у 2022 годзе прыме этап Кубка свету па біятлоне

**Такое рашэнне прынята Міжнародным саюзам біятланістаў. Спартыўны дырэктар IBU Фелікс Бетэрлінг расказаў, што ў 2022 годзе ў Кубак свету будуць уключаны эстонскі Отэпя і Мінск.**



У «Раўбічах» пройдзе сёмы этап Кубка свету — 2021/2022, гонкі адбудуцца якраз пасля Алімпійскіх гульняў у Пекіне, якія стартуюць 28 лютага і працягнуцца да 6 сакавіка.

Адзначым, што раней Беларусь ніколі не прымала этапы біятлоннага Кубка свету, але ў алімпійскім спартыўным комплексе «Раўбічы» ўжо праводзіліся чэмпіянаты свету і Еўропы па біятлоне, а пасля рэканструкцыі ў лютым 2015 года тут адбыўся 49-ы юніёрскі чэмпіянат свету.

Таксама нагадаем, што ў бягучым сезоне ў «Раўбічах» з 18 да 24 лютага 2019 года пройдзе чэмпіянат Еўропы па біятлоне. У ходзе турніру таксама адбудуцца провады з вялікага спорту Дар'і Домрачавай і Надзеі Скардзіна.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# Чэмпіянат свету ў Гомелі парадаваў шашыстаў медалямі

**З 28 кастрычніка па 3 лістапада ў Гомелі прайшоў маладзёжны чэмпіянат свету па шашках-100. На гэты прэстыжны турнір прыехалі каля 250 юных шашыстаў з Кітая, Расіі, Нідэрландаў, Польшчы, Італіі, Украіны, Беларусі, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Казахстана, Венгрыі, Манголіі, Сурынама і Кот-д'Івуара.**

Чэмпіянат свету праходзіў у дзвюх намінацыях: у асноўнай класічнай праграме і бліцы (маланкавай гульні). У бліцы беларусы заваявалі чатыры медалі — два залатыя і два бронзавыя. Чэмпіёнкамі свету сталі сталічныя спартсменкі Паліна Петрусёва і Вікторыя Нікалаева, а бронзавыя медалі заваявалі Георгій Выдзерка і Дар'я Нікіфарава.

У класічнай праграме беларусы заваявалі пяць медалёў — тры залатыя і два бронзавыя. Чэмпіёнамі свету ў «класіцы» сталі Міхаіл Семянюк, Вікторыя Нікалаева і Любоў Кобрына. Бронзавыя медалі заваявалі Яна Лазовік і Анастасія Сакалова.

У выніку беларускія спартсмены заваявалі ў Гомелі дзевяць медалёў — пяць залатых і чатыры сярэбраныя, такім чынам заняўшы другое месца ў камандным заліку, прапусціўшы наперад толькі Расію.

**Яўген САЛАНОВІЧ, майстар спорту СССР па міжнародных і рускіх шашках.**

З нагоды

# АД ПАРТАТЫЎНАГА СУПЕРКАМП'ЮТАРА — ДА КАСМІЧНАГА СПАДАРОЖНІКА




**У 2017 годзе арганізацыі Нацыянальнай акадэміі навук завяршылі ўкараненне 264 сваіх распрацовак.**

37 з іх знайшлі практычнае прымяненне ў медыцыне і фармацыі, 28 — у аграпрамысловым комплексе краіны, 16 — у сферы біятэхналогій і гэтак далей. Аб'ём экспарту тавараў і паслуг НАН за мінулы год перавысіў 50 мільёнаў долараў. У Акадэміі навук зараз функцыянуе больш за 100 розных вытворчасцяў: толькі за два апошнія гады было створана 18 новых вытворчых і доследна-вытворчых участкаў. Напярэдадні святкавання 90-годдзя Нацыянальнай акадэміі навук **старшыня Прэзідыума акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ** сустрэўся з журналістамі, каб падзяліцца інфармацыяй аб найбольш важных і знакавых дасягненнях беларускіх вучоных.

Сёння ў складзе НАН Беларусі працуе сем аддзяленняў навук і 115 арганізацый, дзе занята больш за 15 тысяч чалавек, у тым ліку 73 арганізацыі навуковай сферы, дзе працуюць восем тысяч даследчыкаў. Доля даследчыкаў ва ўзросце да 29 гадоў складае амаль 30 працэнтаў ад усяго складу акадэміі.

— Штогод мы прымаем 320—350 найлепшых выпускнікоў ВНУ, адбіраем найбольш таленавітую моладзь, што дазваляе нам забяспечыць нармальную ратацыю навуковага патэнцыялу, — запэўнівае Уладзімір Гусакоў. — Сярэдні ўзрост па акадэміі ў цяперашні час — 46,3 года, а яшчэ зусім нядаўна ён набліжаўся да 60 гадоў. Моладзь да 40 гадоў складае 45 працэнтаў ад усяго навуковага персаналу.

Беларускія даследчыкі могуць пахваліцца поспехамі ў многіх прыярытэтных напрамках фундаментальных даследаванняў. Так, вучоныя-фізікі прынялі ўдзел у паспяховых эксперыментах, якія пацвердзілі існаванне базона Хігса — гэта адкрыццё мае фундаментальнае значэнне для развіцця ўяўленняў аб структуры матэрыі.

Інфарматыкамі быў адкрыты новы закон размеркавання планетарных адлегласцяў у Сонечнай сістэме. Былі рэалізаваны новыя падыходы ў галіне распрацоўкі метаматэрыялаў для стварэння аптычных сістэм з нанаметровым раздзяленнем, у наналіграфіі — для стварэння сэнсараў новага пакалення. Запуск першага айчыннага спадарожніка даў штуршок развіццю шэрагу адгалінаванняў прамысловасці, і сёння распрацоўкі беларускіх вучоных выкарыстоўваюцца ў міжнародных касмічных праектах па даследаванні Марса і Меркурыя.

На шостым кантыненце планеты поўным ходам ідзе стварэнне Беларускай антарктычнай станцыі. Уведзены ў строй ужо другі яе аб'ект. «Хачу звярнуць увагу, што гэта праца па складанасці не саступае запуску касмічных апаратаў», — падкрэсліў старшыня Прэзідыума НАН.

Прадметам гонару вучоных з'яўляецца персанальны суперкамп'ютар, які выконвае 20 трыльёнаў аперацый у секунду, а па памерах у сто разоў меншы за першапачатковы СКІФ. Шэраг даследаванняў акадэмічных навукоўцаў дазволілі атрымаць вынікі, якія маюць сусветнае прызнанне. Яны датычацца штучных алмазаў, высокаэфектыўных вітамінных прэпаратаў, хімічных і біяхімічных субстанцый, мікрабіялагічных прэпаратаў, сартоў сельскагаспадарчых раслін і іншага. Далёка за межамі Беларусі вядомы распрацоўкі вучоных у галіне лазерных і плазменных тэхналогій, аптычных і лазерных прыбораў, новых матэрыялаў з адмысловымі ўласцівасцямі, радыёэлектронікі, інфарматыкі, стварэння аўтаматызаваных сістэм кіравання і медыцынскай тэхнікі, біятэхналогій, вытворчасці лекавых сродкаў...

У якасці прыкладу Уладзімір Гусакоў прывёў распрацаваны ў Акадэміі навук прэпарат «Флударабел», прызнаны залатым стандартам у лячэнні хранічнай лімфацытарнай лейкеміі. Ён перасягае па фармацэўтычнай чысціні найлепшы нямецкі аналаг, а па кошце — у паўтара раза таннейшы. Акадэмія навук выйшла на прамысловую вытворчасць супрацьпухлінных прэпаратаў новага пакалення, прычым гэта поўны шлях — ад атрымання субстанцыі да гатовай лекавай формы. Створаны біятэхналагічны комплекс, дзе ўжо асвоены дзясяткі найменняў біятэхналагічнай прадукцыі.

Адказваючы на пытанне журналіста «Звязды» аб аплаце працы навукоўцаў, Уладзімір Гусакоў канстатаваў, што яна істотна павысілася (удвая і нават утрая), асабліва ў тых навукоўцаў, якія маюць гранты і ўдзельнічаюць у рэалізацыі розных праектаў. Указ Прэзідэнта № 467 пашырыў правы кіраўнікоў бюджэтных навуковых арганізацый у рэгуляванні ўзроўню аплаты работнікаў і дазволіў прывязваць іх заробкі да вынікаў навуковай дзейнасці. Напрыклад, у Інстытуце фізікі НАН ёсць вучоныя, якія атрымліваюць больш за чатыры тысячы рублёў у месяц. Зараз палова з 14 навуковых цэнтраў інстытута просяць кіраўніцтва акадэміі дазволіць павысіць тарыфныя аклады сваім супрацоўнікам на 300 працэнтаў.

Па словах **старшыні Савета маладых навукоўцаў НАН Беларусі, намесніка дырэктара па навуковай рабоце Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі НАН Беларусі Андрэя ІВАНЦА**, раней зарплаты маладых вучоных былі прывязаныя да стаўкі першага тарыфнага разраду, і малодшы навуковы супрацоўнік альбо яго стажор не маглі атрымліваць больш высокі заробак нават пры самай актыўнай рабоце. А цяпер з'явіліся інструменты для дыферэнцыяцыі і стымулявання, і пры ўмове ўдзелу ў тых ці іншых праектах малады спецыяліст можа атрымліваць ужо да адной тысячы рублёў у месяц з выкарыстаннем каэфіцыента ў 200 працэнтаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «Не меншая праблема, чым незаконны гандаль»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Задача экскурсавода не проста вывучыць свой тэкст, але і быць усебакова развітым, — заўважае Алена Ліхімовіч.

Ахвотных трапіць у прафесію шмат (сярод іх і гісторыкі, і «тэхнары»), таму атэстацыю праводзяць кожны месяц. У сярэднім адсейваецца 30 працэнтаў прэтэндэнтаў.

— Многія элементарна не ведаюць гісторыю Беларусі, — прызнаецца намеснік дырэктара агенцтва. — Так, у нас ёсць правіла, што не трэба сыпаць датамі, бо людзі іх у вялікай колькасці не запамінаюць. Але блытацца ў стагоддзях... На нядаўняй атэстацыі была дзяўчына, якая не змагла адказаць, калі пачалася Другая сусветная вайна. А калі яе спыталі пра Першую сусветную, здзівілася: «А што, і такая была?» Рэч Паспалітая для некаторых — гэта проста Польшча, Вялікае Княства Літоўскае — Літва. Цікавішся: «Дзе ж тады была Беларусь?» — губляюцца. Многія потым спрачаюцца: маўляў, гід не павінен ведаць усю гісторыю, калі яго маршрут — Мінск. Але экскурсавод — гэта твар краіны. Мала таго, ён мусіць прытрымлівацца той ідэалогіі, якая існуе ў нас. Не спрабаваць навязаць меркаванні псеўдагісторыкаў, умець абыходзіць слізкія пытанні.

Іншая прэтэнзія да кандыдатаў — няведанне методыкі правядзення экскурсіі. «Некаторыя лічаць, што гэта вельмі лёгка: пагаварыў — і атрымаў грошы. Але гэта не лекцыя ва ўніверсітэце. Трэба расказаць пра горад і паказаць яго так, каб людзі палюбілі яго і захацелі вярнуцца. Таму экскурсавод мусіць ведаць псіхалогію і быць крыху акцёрам», — адзначае Алена Ліхімовіч.

На сёння атэставана 882 экскурсаводы. 355 з іх — мінскія. Менш за ўсё экскурсаводаў у Магілёўскай і Гомельскай абласцях — 57 і 20 адпаведна. Гідаў-перакладчыкаў у краіне 185. Праўда, у некаторых абласцях (Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай) усяго па адным спецыялісце. Большасць гідаў працуе на англійскай мове. Хапае таксама тых, хто валодае польскай, нямецкай, французскай, італьянскай і кітайскай.

— Нядаўна з'явіліся два гіды-перакладчыкі, якія ведаюць японскую мову. Турысты з Японіі пачалі ездзіць да нас, і сёння гэтыя два чалавекі нарасхват. Доўга ў нас не было спецыялістаў, якія валодалі б турэцкай мовай, — цяпер такіх пяць, — расказвае Алена Ліхімовіч. І дадае, што праблема з гідамі ў рэгіёнах сапраўды ёсць. — Таму актыўна працуем, каб прыцягнуць у прафесію тых жа выпускнікоў Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта.

Самая распаўсюджаная экскурсія, па якой атэстоўваюцца, — «Мінск — сталіца Рэспублікі Беларусь». Гэта самы прадавальны маршрут. Актыўна абараняюць тэму «Архітэктурныя помнікі Міра і Нясвіжа». Калі казаць пра ваенна-гістарычны кірунак, то папулярныя экскурсіі па Лініі Сталіна і Хатыні.

## Узмацненне жорсткасці ў сферы неабходна?

Як турыст можа быць упэўнены, што заказвае паслугі прафесіянала? Ці ёсць у чалавека пасведчанне аб атэстацыі, можна праверыць на сайце belarustourism.by. Там ёсць раздзел, прысвечаны гідам, дзе пазначаны іх кантактныя даныя, тэмы, якія яны абаранілі (вадзіць экскурсіі яны маюць права толькі па гэтых маршрутах). Пры сабе атэставаны спецыяліст павінен мець таксама бэйдж.

Тых, хто працуе без бэйджа або па тэме, якую не абараняў, могуць пакараць — пазбавіць пасведчання аб атэстацыі на тэрмін да года.

А вось прыцягнуць да адказнасці нелегальных гідаў (тых, хто не здаваў адпаведных экзаменаў) немагчыма — заканадаўства такога інструмента не прадугледжвае.

— Пакуль гэта больш меры выхаваўчага характару, калі прафесійныя экскурсаводы падыходзяць растлумачыць, што так нельга, ці задаюць каверзныя пытанні, каб паказаць групе, што перад імі некваліфікаваны чалавек, — дзеліцца **намеснік дырэктара Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Віталь ГРЫЦЭВІЧ.** — Але мы працуем над гэтым. На наступны год прадугледжана ўнясенне змяненняў у заканадаўства, магчыма, гэта будзе асобны артыкул у Кодэксе аб адміністрацыйных правапарушэннях. Як бы мы цяпер ні імкнуліся да лібералізацыі, напэўна, у дадзенай сферы ўзмацненне жорсткасці неабходна. Будзем рабіць правілы вядзення экскурсій на тэрыторыі Беларусі больш строгімі. Акрамя таго, што нелегальны экскурсавод займаецца незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю, ён яшчэ і няправільна даносіць інфармацыю.

Змены спрабавалі ўнесці яшчэ летась. Але ўсё скончылася на ўзроўні абмеркавання: спецыялісты іншых устаноў палічылі, што парушэнні не носяць масавага характару.

— Напэўна, яны крыху недаацэньваюць гэтай небяспекі, — мяркуе Віталь Грыцэвіч. — Хоць з майго пункту гледжання, гэта не меншая праблема, чым незаконны гандаль каля крамы. Там магчыма атручэнне, бо невядома, што за тавар. А ў нашай сітуацыі ёсць рызыка «атручэння мозга», і гэта трэба папярэджваць. Думаю, налета зможам пераканаць іншыя органы, што неабходны асобны артыкул па дзейнасці экскурсаводаў.

Пасля ўвядзення бязвізавага рэжыму вырас паток турыстаў у Брэсцкую і Гродзенскую вобласці. Часта палякі і літоўцы прыязджаюць да нас са сваімі экскурсаводамі.

— Даволі складана праверыць, што яны расказваюць, — звяртае ўвагу на яшчэ адну праблему прадстаўнік міністэрства. — Падзіцеся, у нас рознае бачанне гісторыі. Вядома, гід, які прыехаў з групай з-за мяжы, можа вадзіць у нас экскурсію, але для гэтага ён павінен тут прайсці атэстацыю па канкрэтным маршруце.

Але ж, як паказвае практыка, некампетэнтнымі часам аказваюцца і атэставаныя гіды. Ці правярае хто-небудзь іх дзейнасць пасля атэстацыі, у «палях»? Можа, запускаюць «таемнага пакупніка», каб ён паслухаў, што расказваецца групе? Віталь Грыцэвіч адказвае, што не, такой работы не вядзецца.

— На мой погляд, практыка, стаўленне спажыўца пакажуць, наколькі той ці іншы экскурсавод добры. Калі ён непрафесіянал, то праз некалькі месяцаў пойдуць чуткі, што з ім працаваць нецікава, і турфірмы самі адмовяцца ад яго паслуг. І ўсё — чалавек застанецца без работы. Любая скарга турыста — пляма на рэпутацыі. Рынак сам адсякае неспецыялістаў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

**Меркаванне**

## Варта ўвесці штрафы

На думку **старшыні Беларускага грамадскага аб'яднання экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў Мікалая ЧЫРСКАГА,** ёсць праблема з падрыхтоўкай кадраў. Напрыклад, каледжы выпускаюць спецыялістаў з кваліфікацыяй «Турагент. Экскурсавод». Але ж гэта дзве зусім розныя прафесіі, слушна заўважае эксперт.

Каб абараніць рынак паслуг ад непрафесіяналаў, Мікалай Чырскі прапануе ўнесці ў Грамадзянскі кодэкс два артыкулы. Першы — аб тым, што нельга праводзіць экскурсію на тэрыторыі Беларусі без нагруднага знака-ідэнтыфікатара, які пацвярджае права правядзення экскурсіі на аб'ектах паказу і выдаецца Міністэрствам спорту і турызму. Другі — пра тое, што гіды могуць рэкламаваць сябе ў СМІ ці інтэрнэце толькі з указаннем тэм, па якіх яны атэставаны. За парушэнне прапануецца ўвесці штрафныя санкцыі — ад 50 да 100 базавых велічынь.

За мяжой у некаторых музеях суправаджаць турыстычныя групы маюць права толькі супрацоўнікі гэтых устаноў. Мікалай Чырскі кажа, што гэта нармальная практыка.

— Калі старонні гід хоча праводзіць экскурсіі па музеях, яны павінны там акрэдытавацца. Так дзейнічаюць і ў некаторых нашых установах: музейныя работнікі прымаюць тэкст экскурсіі і тады даюць дазвол.

Ці не абмяжоўвае гэта свабоду гідаў? Эксперт лічыць такі строгі падыход апраўданым.

— Прапаганда — важная частка ідэалогіі дзяржавы. А экскурсавод — гэта прапагандыст. На падставе таго, як ён выглядае, як і што гаворыць, складаецца ўражанне аб нашай краіне.




## ПРЫВІТАННЕ З МІНУЛАГА

Даўно гэта было... І не сплыло, як той казаў: у памяці першае месца працы (яно было ў Жлобіне), першая выбарная пасада. Сакратар камсамольскай арганізацыі — гэта ж вам не абы-што! А далей болей — старшыня рэвізійнай камісіі райкама, бо яму ж, райкаму, трэ было ведаць, ці кожны камсамолец заплаціў узносы, ці правільна іх утрымалі?

Я правярала. Яшчэ і ў раёне. Часам ад вёскі да вёскі хадзіла па цаліку, як Павел Карчагін (не блытаць з Марозавым) па вузкакалейцы, бо мы, камсамольцы, і сапраўды былі дабравольцамі, хоць, здаралася, і прэміі райкам выдаваў. Мне — ажно дзваццацьпятку! Праўда, адночы... І я доўга не магла патраціць яе, бо гэта ж як ордэн — хоць на грудзі павесь!..

А потым — не вам казаць — развалілся Саюз, кампартыя і, здавалася, камсамол? Аднак гадоў дзесяць таму я атрымала віншаванне з яго дзевяностагоддзем, прычым на адваротным баку з прыпіскай: «Так трымаць, юны мічурынец!». Выходзіць, былыя саратнікі не толькі помнілі мяне, але і нешта ведалі? (Я ў той час са старонак «Звязды» якраз дзялілася вопытам па вырошчванні кавуноў і баклажанаў.)

Ці трэба казаць, як жа гэта расчуліла?! Я нават здагадалася, хто мог прыпіску зрабіць...

І сёлета быў званок.

— Пазнала? — пасля прывітанняў спытаў нехта з таго канца проваду.

— Не, — кажу.

— А з райкама камсамола ці помніш каго?

— Ну вядома ж... Люду Зарэцкую.

— Дык гэта я.

— Ты? — здзіўляюся. — Вось не чакала!..

Ад Людмілы я даведалася, што з камсамолам яна ды іншыя так і не рассталіся: падтрымліваюць адносіны, ведаюць — хто, дзе, як. Нехта — у вялікіх начальніках, нехта — сярод вучоных, многія — на пенсіі, а хто-ніхто, на жаль, ужо і адышоў — назусім... На іх (і сем'і) «камсамольцы» таксама не забыліся.

Дык вось (гэта Людміла расказвала), прыехалі яны неяк на магілку, каб памянуць аднаго з таварышаў. Па грамульцы выпілі. І яму ў чарку налілі — пастаялі, расказалі нябожчыку пра справы свае. А непадалёк ад гэтага — праз пару магілак — пахаваны іншы таварыш. Яму таксама налілі. І пагаманілі... Падаліся да трэцяга, спачатку адумаўшы («спінным мозгам»), а потым і ўбачыўшы, што за імі... сочаць, прычым двое: дзядзька сам па сабе, цётка — сама... І калі з першым усё зразумела (у яго на твары напісана: чакае, пакуль нябожчыку нальюць, а самі адыдуцца...), то з другой — невядома што... Уся бледная...

А камсамольцы ж, як вядома, людзі нераўнадушныя. І таму рашуча, учацвярых падаліся ў бок цёткі (дзядзька, спужаны, уцёк), каб спытаць, можа, ёй дапамога патрэбна?

Тая — задам, задам — пачала адступаць на ўсякі выпадак. «Дзеўкі» здалёк ёй:

— Не бойцеся... Мы камсамольцы...

Цётка, учуўшы, аж села ля нейчай абгародкі і давай хрысціцца: маўляў, сыдзі, нячыстая!..

Ледзь растлумачылі ёй, што няма тут падману, што яны і праўда камсамольцы, але ж 70-х гадоў, што прыйшлі наведаць таварышаў.

А ўрэшце адпаілі жанчыну валяр'янкай, і яна прызналася, што ёй проста цікава было, што ж гэта за людзі ходзяць і каля многіх магіл спыняюцца? Можа, нейкая секта з'явілася?

...Так што былі камсамольцы — па перакананнях — і, напэўна ж, ёсць. Здымаю капялюш! І як у песні — «не расстанусь...». З тымі, сапраўднымі.

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

## НЕ Ў ТРОХ СОСНАХ

«...За плячыма два гады вучобы, атрымала прафесію, значыць, пара на свой хлеб», — думала маладая медсястрычка па дарозе ў незнаёмую вёску. Недзе там была яе першая бальніца, там — самастойнае жыццё.

Пачыналася яно ў здымным пакоі — у кватэры вельмі спагадлівай і гасціннай Зоі Паўлаўны, якая на той час ужо мела адну кватарантку, таксама медсястру. Не дзіва, што дзяўчаты адразу пасябравалі і паміж сабой, і з гаспадыняй.

Яна, Зоя Паўлаўна, на здароўе асабліва не наракала, хіба ногі яе падводзілі: не магла далёка хадзіць. А тут лісічкі ў лесе з'явіліся, падасінавікі, баравікі... Захацелася ёй грыбоў — і свежых паесці, і нарыхтоўкі зрабіць.

Пачуўшы гэта, кватаранткі паабяцалі, што ў наступны ж выхадны яны самі сходзяць у лес і вернуцца адтуль з поўнымі кашамі.

Як сказалі, так і зрабілі: падхапіліся ў суботу ледзь не з першымі пеўнямі, хуценька сабраліся — выйшлі за вёску. Перад імі раскінулася шырознае калгаснае поле, а ўжо за ім відneўся прыгожы лес.

Да яго дзяўчаты ішлі, трымаючы ў полі зроку лінію электраперадачы. «Гэтак жа, — сказалі сабе, — будзем вяртацца дамоў».

Але ж тое — потым. А спачатку ў іх была цікавая размова і лясная прахалода з чароўнай цішынёй, водар траў, спевы птушак, грыбы — нарэшце! Іх, дарэчы, не сказаць каб шмат было, пошукі прымушалі дзяўчат ісці наперад, збочваць направа, налева...

Карацей, наладаваўшы поўныя кашы, грыбнікі з жахам зразумелі, што яны канчаткова заблудзілі. «Дзе наша вёска? У які бок ісці?» — думалі яны. Можна было б залезці на дрэва і паглядзець. Але як, калі знізу ўсе сосны «голыя»?

Расстроіліся ледзь да слёз. Пашукалі нейкіх сцежак-дарог, выбіліся з сіл, адпачылі, зноў пайшлі на пошукі і раптам — вачам не паверылі — непадалёк прамільгнула... карова.

З надзеяй, што рагуля зможа вывесці іх да людзей, дзяўчаты кінуліся следам. Але ж сілы ў іх былі, што называецца, няроўныя: карова бегла куды хутчэй і таму хутка... знікла — гэтак жа нечакана, як і з'явілася. Пакінула, праўда, сляды...

Па іх сяброўкі выйшлі на дарогу і ўбачылі адтуль знаёмыя слупы.

...У вёску вярталіся, можна сказаць, на змярканні. Зоя Паўлаўна, чаго толькі не перадумаўшы, чакала іх каля весніц і з радасці, што знайшліся, сустракала з абдымкамі.

Потым і ўсе разам яны вячэралі, перабіралі ды марынавалі грыбы, каб зімой, адкрыўшы да гарачай бульбачкі чарговы слоік, зноў і зноў успамінаць той паход у лес і тую карову-выратавальніцу.

**Таццяна Чэкед,**
*г. Гомель.*

## НЕ ВЕР ВУШАМ СВАІМ

П'яніц сёння ўсюды шмат, але ж у гарадах яны неяк менш кідаюцца ў вочы. А вось у вёсках...

Я амаль усё жыццё адпрацавала ў гандлі, 17 гадоў загадвала пасялковай крамай, так што мела «шчасце» нагледзецца, колькі гора і бяды прыносіць гарэлка, колькі розных прыгод здараецца з п'янымі. Часам не разбярэш нават смешных ці сумных.

Такім чынам, адной жанчыне гадоў колькі таму добра пашчасціла. Па-першае, калгас ёй выдаў пуцёўку ў дом адпачынку, па-другое, адтуль яна прыехала не адна: пазнаёмілася з мужчынам, прывезла яго ў госці. Але ж яму тут, трэба разумець, спадабалася. Вось і застаўся: уладкаваўся на ферму падвозчыкам кармоў, каторы год жыве і ўжо сам гасцей прымае. Летам, напрыклад, да яго сястра прыязджала, з-за мяжы, можна сказаць, з Украіны.

З гэтай радаснай нагоды, да таго ж якраз пасля зарплаты, гаспадары захацелі наладзіць «прыём» — накрыць паляну, як той казаў, пасядзець на прыродзе.

Перад гэтым на кані (а ён у падвозчыкаў заўжды пад рукой) прыехалі ў краму, купілі спіртнога, закускі, сабралі кампанію, бо трэба ж пазнаёміць прыезджую з новай раднёй, з сябрамі.

На ўсё пра ўсё выпіўкі, як гэта часта бывае, застольнікам не хапіла — прыехалі ў краму па дабаўку.

— Ад душы пасядзелі! Так павесяліліся, — расказвалі жанчыны, запіхваючы ў торбы новыя пляшкі з віном. — Пасля працы яшчэ пабалюем.

— Ідзіце ўжо на ферму, на дойку пара, — казала ім кабета з вёскі. — Вы ж і так набалявaліся, аж брыдка глядзець: ногі не трымаюць... Бач, усселі на падводу...

Цягнуць яе каню і праўда цяжкавата было, ён ледзьве спраўляўся. Таму цвярозейшыя ўдзельнікі «банкету», напаўняючы наваколле то крыкам, то спевам, то піскам, крочылі побач. Віноўніца ўрачыстасцяў, госця з замежжа, ну вядома ж, была на возе, бо яна, казалі, не толькі ісці, — нават ехаць ужо не магла — увесь час спаўзала з воза... Таму побач прыладкавалася Ганка, навaспечаная сваячка. Яна як магла падтрымлівала прыезджую, аж пакуль тая на пад'ездзе да вёскі раптам не закрычала:

— Ой, нагаўкалэсі!

— Праўду, праўду кажаш, сястрыца! — пагадзілася з ёй сваячка. — І напіліся, і наеліся... Ну, можна сказаць, і нагаўкаліся... "Пагудзелі»! А зараз — што ты стаў? — спытала яна ў вазьніцы. — Паганяй! З ветрыкам правязём нашу госцю.

Брат яе, той прыезджай, што быў за кіроўцу, узмахнуў быў пугай, пасля чаго, яшчэ раз закрычаўшы, жанчына зваліліся з воза, Ганка — следам.

— Куча рагоча, хто болей хоча? — крыкнула яна (конь, на шчасце, тут жа спыніўся), схапілася за кола, каб устаць, і перад самым носам (хмелю — як не было) убачыла... акрываўленую нагу госці.

— Вось табе і «нагаўкаліся», — заўважыў вясковец, які назіраў за гарлапанамі, калі тых яшчэ пад'язджалі да яго сялібы.

Так што зараз яму нічога не заставалася, як выйсці на вуліцу, дапамагчы вызваліць з кола пакалечаную нагу, выклікаць «хуткую». На шчасце, назву сваю гэта машына з гонарам апраўдала: прыехала вельмі хутка. Але ж калі тая госця папраўціца, не ведае ніхто. Адно зразумела: «гасціннасць» сясцёр-беларусак яна запомніць надоўга. Можа, нават на ўсё жыццё.

**Марыя Бжян,**
*г. Чэрвень.*

**Рубрыку вядзе**
**Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# «Смаленне вепрука». Версія XXI

### Згадка, што грэе ў лістападзе

Не ведаю, як для каго, а для мяне дзень сёмага лістапада (а даўней, калі хто памятае, выхадным было і восьмае чысло — «акцябрскія», як казалі ў нас у вёсцы) з дзяцінства звязаны не з дэманстрацыямі, не з фільмамі пра Леніна і рэвалюцыю, не са святочнымі канцэртамі. На "акцябрскія" штогод быў іншы клопат, да якога далучаліся ўсе сямейнікі, нават прыезджыя з горада. Напачатку лістапада ўжо звычайна добра падмарожвала нанач, апалае лісце станавілася каляным і рыпела пад нагамі, на лужынах раніцай крышыўся тонкі празрысты лёд, і краі ў яго былі тонкія і вострыя, бы на пабітай шыбе. Такое надвор'е было знакам, што аднаму з гадаванцаў, які сыта рохкалі ў хляве, прыйшоў час скласці галаву дзеля харчовай бяспекі адной асобна ўзятай сям'і (зрэшты, дзеля гэтага яго, маленькае пісклівае парасятка, увесну з ракаўскага кірмашу ў мяшку і прывозілі, і фінал тут быў самы што ні ёсць прадказальны)...

Гэта было такой натуральнай і абавязковай часткай вясковага жыцця, як і сяўба, і сена, і капанне бульбы, таму я (уяўляю, як страпянуцца зараз абаронцы жывёл) тое свінчо, якога любіла чухаць па спіне і якому ўлетку рвала з бабуляй самую буйную макрыцу, асабліва не шкадавала. Гэта вельмі засмучала маю маму, якая баялася, што дзіця вырасце чэрствым і жорсткім. І як было ёй растлумачыць, што ўсё, што адбывалася ў той дзень на падворку ля хлява, а пасля каля хаты і ўжо ўвечары на кухні, складвалася ў дзіцячым уяўленні ў адно надзвычай цікавае, амаль чароўнае дзейства, і прычыніцца да яго — да сапраўды жорсткага, але рэальнага свету дарослых — было сапраўдным шчасцем. Да таго ж, з маленства прыходзіла разуменне, што забіваць жывое можна не дзеля пацехі, а толькі дзеля неабходнасці, калі трэба карміць сям'ю, напрыклад. Не самае шкоднае ў жыцці разуменне, якога, здаецца, сёння многім не хапае.

Тым больш што гаспадар — бацька, сам тое свінчо ніколі не забіваў. Дзеля гэтага клікалі вясковага спецыяліста — дзядзьку Івана, ён прыходзіў са сваім вострым доўгім шылам і рабіў сваю справу маланкава хутка — няшчасная ахвяра, здаралася, не паспявала нават завішчаць. Потым мужчыны з цяжкасцю клалі свінчо на спецыяльна знятыя з петляў дзеля гэткай важнай справы дзверы хлява, пакладзеныя на тоўстыя калодкі. Шыла з раны даставалі, на яго месца ўтыкалі невялікую завостраную палачку — «каб сала крывёй не заплыло». Мужчыны нейкі час корпаліся з газавымі лямпамі для смалення (іх звалі проста — машынкі), і вось ужо пачынала гудзець і выплёўваць блакітна-аранжавае бляклa-імклівае полымя адна, другая, трэцяя, у паветры пахла паленай шчэццю і падсмажанай скурай, а свінчо, ужо падобнае на нерухомую васковую ляльку з бульбінай у прыадкрытым роце, пакрысе пакрывалася цёмнымі бліскучымі плямамі, пакуль усё не станавілася гладка-чорным...

Мужчыны бралі доўгія шырокія нажы і пачыналі абсмаленае саскрабаць. А жанчыны ўжо неслі з хаты гарачую ваду і анучы, і ў воблаку пары, якая падымалася ад тазоў і вёдраў, свінку пачыналі мыць, і яна зноў свяцілася, але была ўжо крамяна-чысценькай, аж трымцела пад анучамі... Бацька браў самы востры нож, падстаўляў вялікі таз — і ён хутка напаўняўся крывёю, якую пасля клапатліва злівалі ў трохлітровы слоік, а ў іншай пасудзіне ўжо ляжала аблавухая свіная галава. Буйны посуд быў задзейнічаны ўвесь, нават вялікія ночвы — туды клалі ўсе вантробы... Але цікавейшае пачыналася ў хаце — там ужо скварчэла на патэльні свежына і нарэзаная буйнымі кавалкамі пячонка. Жанчыны накрывалі на стол. Пачастунак быў немудрагелісты — тое, што на патэльні, ды яшчэ шаткаваная капуста, якая да таго часу паспявала скваcіцца, ды лусты хлеба (шчыра: за ўсё жыццё мала што даводзілася каштаваць смачнейшае)... Хлопцы насілі посуд са свежынай у сенцы, пакуль накрывалася на стол, яны нават дзверы спраўляліся памыць і павесіць на месца. Яшчэ не паспяваў зашарэць ранні лістападаўскі надвячорак, а ў двары ўжо ад нядаўняй мітусні і знаку не было, заставаліся толькі цёмныя плямы на адталай зямлі, на якія тут жа зляталіся гарластыя сарокі.

А ў хаце адзначалі «кальцікі». Праўда, надоўга — выпівалі чарку-другую і разыходзіліся, бо яшчэ было шмат спраў на вечар. Жанчыны чысцілі кішкі (бо як жа без іх зрабіць крывянку або каўбасу?) — тоўстыя — вымывалі над вядром, тонкія — акуратна, каб не парваць, выскрабалі на стале тупым бокам нажа. Мужчыны секлі на кавалкі косткі — каб улезлі ў гаршчок ці каструлю. Наразаліся дзялкі свежыны: кавалак сала, кавалак пячонкі, пару костачак. Іх разносілі суседзям і сваякам — тыя, закалоўшы сваё свінчо, таксама частавалі падобным наборам. Назаўтра рабілі каўбасы (пакуль не з'явілася спецыяльная насадка на мясарубку, якую нехта прывёз з горада, фарш сапраўды літаральна пхалі пальцам у кішку праз бляшаную трубку), варылі галавізну і вантробы на тушонку і сальцісон (у нас яго звалі трыбух), пeратоплівалі ў вялікім гаршку тлушч, клалі ў кубелец і перасыпалі буйной соллю сала, салілі і, загарнуўшы ў марлю, падвешвалі на столь каля печы кавалкі кумпяка... І незаўважна для сябе ўздыхалі з палёгкай: будзе што ўкінуць у суп і на патэльню, пакласці ў ссабойку, даць студэнтам у горад. Можна спакойна сустракаць зіму...

Такое вось «Смаленне вепрука» ў мяне атрымалася. Без філасофіі, без лірычных адступленняў, без горычы, як у Міхася Стральцова. Хоць як тут яго не ўспомніць, калі ў напаўжывой вёсцы стаіць халодная, зачыненая на зіму родная хата, пахіліўся страхой да зямлі даўно ўжо пусты хлеў, а родныя людзі прыходзяць толькі ў снах ды дзіцячых успамінах. І як тут не перачытаць яшчэ раз тое горкае яго апавяданне, каб зноў лістападаўскім настылым днём сагрэцца далёкай згадкай ды прабегчы вачыма па такіх зразумелых радках: «Ёсць, на жаль, рэчы, непадуладныя нам, але ж ёсць і суцяшэнне, ёсць і надзея. У таго, хто бярэ ў рукі пяро, надзея ёсць таксама. О, паэт да таго ж бывае яшчэ крыху забабонным. Наіўны, ён хоча перамагчы сапраўднасць, ён хоча верыць: я засцярогся ад бяды — бо сказаў. Дабро і надзея тут накрэслілі свой круг...»

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 26 ноября 2018 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 25 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Условия продажи:** **1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя | | | | |
| **Местонахождение лотов №№ 1–4, 6–8:** Гомельская область, Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7 | | | | |
| 1 | Установка для приема товарного бетона УВР-7, № 936 | **6 146,10** | 307,31 | 614,61 |
| 2 | Фильтр ФЭСВ-1200 с вытяжным устройством R-7,3М, № 971 | **1 845,00** | 92,25 | 184,50 |
| 3 | Штукатурная станция СШВ-6 (передвижная), № 904 | **2 341,80** | 117,09 | 234,18 |
| 4 | Штукатурная станция ШС-4/6 № 44/10083 | **2 472,30** | 123,62 | 247,23 |
| 6 | Вагон-бытовка 9000*3000, № 933 | **1 890,00** | 94,50 | 189,00 |
| 7 | Вагон-бытовка 6500*3000, № 931 | **2 151,90** | 107,60 | 215,19 |
| 8 | Малярная станция (вагон), № 176 | **2 439,00** | 121,95 | 243,90 |
| **Местонахождение лотов №№ 9–11:** Гомельская область, Рогачевский р-н, н. п. Заречье | | | | |
| 9 | Вагон-бытовка 6500*3000, № 44/10078 | **1 891,80** | 94,59 | 189,18 |
| 10 | Вагон-бытовка 9000*3000, № 44/10080 | **2 723,40** | 136,17 | 272,34 |
| 11 | Вагон-бытовка 9000*3000, № 44/10079 | **2 584,80** | 129,24 | 258,48 |
| 12 | Вагон-бытовка 9000*3000, № 44/10081. **Местонахождение:** Гомельская область, Рогачевский р-н, а. г. Тихиничи | **2 589,30** | 129,47 | 258,93 |
| 13 | **Капитальное строение с инв. № 322/17016**, общей площадью **7,0 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное здание насосной станции с резервуаром чистой воды (инв. № 96). Капитальное строение с инв. № 322/13307**, общей площадью **25,9 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное здание склада кислородных баллонов (инв. № 95). Капитальное строение с инв. № 322/17013**, общей площадью **29,3 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное металлическое здание навеса для металлических баллонов (инв. № 10050). Капитальное строение с инв. № 322/С-17014**, общей площадью **12,4 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное металлическое здание склада для металлических баллонов (инв. № 10051). Капитальное строение с инв. № 322/С-17012**, общей площадью **133,2 кв. м,** назначение — здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное дощатое здание (инв. № 10059). Капитальное строение с инв. № 322/С-13309**, общей площадью **460,1 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **двухэтажное кирпичное административное здание с подвалом (инв. № 91а). Местонахождение:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кожедуба, д. 3. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **324750100002000064** общей площадью **1,8809 га (право постоянного пользования).** Целевое назначение земельного участка: **для обслуживания производственной базы (СПМК-44). Подробный и полный перечень имущества по лоту № 6 опубликован в газете «Звязда» от 23.08.2018 г. № 161 (28777)** | **496 215,00** | 24 810,75 | 49 621,50 |
| **Местонахождение лотов №№ 14–16:** Гомельская область, Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кожедуба, 3 | | | | |
| 14 | Станок токарно-винторезный, № 44/66 | **3 330,00** | 166,50 | 333,00 |
| 15 | Станок трубонарезной ВМС-2А с резьбонарезной головкой и комплектом головок, № 44/40217 | **2 070,00** | 103,50 | 207,00 |
| 16 | Консольный кран КК 0,5тн, № 44/70 | **2 160,00** | 108,00 | 216,00 |
| **Местонахождение лотов №№ 17–20:** Гомельская область, Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кирова, д. 28 | | | | |
| 17 | Станок токарно-винторезный 16ГС30-01, инв. № 44/44а | **6 023,70** | 301,19 | 602,37 |
| 18 | Форма для пустотных плит ПК-72-15, инв. № 44/325 | **3 449,70** | 172,49 | 344,97 |
| 19 | Емкость металлическая (горизонтальная), 15 куб. м, инв. № 44/61922 | **3 468,60** | 173,43 | 346,86 |
| 20 | Емкость металлическая (горизонтальная), 25 куб. м, инв. № 44/61926 | **2 734,20** | 136,71 | 273,42 |
| **Местонахождение лотов №№ 21, 23–25, 27–40, 43–49, 51–53, 55–63:** Гомельская область, Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7 | | | | |
| 21 | Автобетоносмеситель КАМАЗ 53229 К, рег. № АК 5298-3, г. в. 2005, цвет – оранжевый, тип ТС – грузовой специальный автобетоносмеситель. Автокран ЗИЛ-133-ГУА, рег. № 8334ГСН, г. в. 1988, цвет – голубой, тип ТС – грузовой специальный автокран | **13 050,00** | 652,50 | 1 305,00 |
| 23 | Автомобиль ГАЗ-САЗ – 3507, рег. № 8545 ГСН, г. в.1989, цвет – голубой, тип ТС – грузовой самосвал | **2 700,00** | 135,00 | 270,00 |
| 24 | Автомобиль ЗИЛ-ММЗ- 4502, рег. № ЕА 5611, г. в. 1991, цвет – голубой, тип ТС – грузовой самосвал | **2 430,00** | 121,50 | 243,00 |
| 25 | Автомобиль МАЗ 5432 А5, рег. № АВ 6370-3, г. в. 2008, цвет – белый, тип ТС – грузовой седельный тягач | **7 920,00** | 396,00 | 792,00 |
| 27 | Автомобиль МАЗ 5432 А5, рег. № АК 3524-3, г. в. 2008, цвет – белый, тип ТС – грузовой седельный тягач | **7 470,00** | 373,50 | 747,00 |
| 28 | Автомобиль МАЗ 6422 А5, рег. № АК 3525-3, г. в. 2009, цвет – желтый, тип ТС – грузовой седельный тягач | **13 140,00** | 657,00 | 1 314,00 |
| 29 | Автомобиль МАЗ 642205, рег. № АЕ 7469-3, г. в. 2010, цвет – белый, тип ТС – грузовой седельный тягач | **13 140,00** | 657,00 | 1 314,00 |
| 30 | Экскаватор пневмоколесный ЕК-14, рег. № ЕА-3 7306, г. в. 2006, марка двигателя – Д-245 | **15 210,00** | 760,50 | 1 521,00 |
| 31 | Экскаватор пневмоколесный ЕК-1200, рег. № ЕА-3 9115, г. в. 2007, марка двигателя – Д-243с | **11 610,00** | 580,50 | 1 161,00 |
| 32 | Автобетоносмеситель МАЗ 6303А3 СМБ-372-30, рег. № АЕ 0215-3, г. в. 2009, цвет – белый, тип ТС – грузовой специальный автобетоносмеситель | **33 840,00** | 1 692,00 | 3 384,00 |
| 33 | Автобус МАЗ 256270, рег. № АЕ 7317-3, г. в. 2010, цвет – бордовый, тип ТС – автобус вагон | **29 610,00** | 1 480,50 | 2 961,00 |
| 34 | Автобус МАЗ 256270, рег. № АВ 1882-3, г. в. 2007, цвет – белый, тип ТС – автобус вагон | **17 910,00** | 895,50 | 1 791,00 |
| 35 | Погрузчик-экскаватор А-310 ПЭ на базе трактора «Беларус» 82П, рег. № ЕВ 3 6558, г. в. 2008, марка двигателя – Д-243 | **11 700,00** | 585,00 | 1 170,00 |
| 36 | Узел бетонный самозагружающийся FIORI DB350S, рег. № ЕВ-3 0370, г. в. 2008 | **73 530,00** | 3 676,50 | 7 353,00 |
| 37 | Шасси погрузочное многофункциональное «АМКАДОР» 332С-4, рег. № ЕВ-3 2564, г. в. 2009 | **25 650,00** | 1 282,50 | 2 565,00 |
| 38 | Экскаватор пневмоколесный гидравлический EW-1400, рег. № ЕВ-3 4134, г. в. 2011, марка двигателя – Д-245 | **69 930,00** | 3 496,50 | 6 993,00 |
| 39 | Экскаватор-погрузчик ПЭ-82 на базе трактора «Беларус» 82П, рег. № ЕВ-3 1107, г. в. 2008, марка двигателя – Д-243 | **12 420,00** | 621,00 | 1 242,00 |
| 40 | Экскаватор-погрузчик «Амкадор» 702ЕМ-03 на базе трактора «Беларус» 92П, рег. № ЕВ-3 5785, г. в. 2000, марка двигателя – Д-245 | **22 770,00** | 1 138,50 | 2 277,00 |
| 43 | Автомобиль ГАЗ 5201, рег. № 7134 ГСП, г. в. не определен, цвет – голубой, тип ТС – грузовой бортовой | **2 340,00** | 117,00 | 234,00 |
| 44 | Автомобиль МАЗ 555102 2125, рег. № EI 0329, г. в. 2005, цвет – оранжевый, тип ТС – грузовой самосвал | **7 020,00** | 351,00 | 702,00 |
| 45 | Автомобиль ГАЗ 32213, рег. № АВ 4799-3, г. в. 2008, цвет – темно-сине-зеленый, тип ТС – автобус-вагон | **3 150,00** | 157,50 | 315,00 |
| 46 | Автомобиль ГАЗ 32213, рег. № АВ 4800-3, г. в. 2008, цвет – темно-сине-зеленый, тип ТС – автобус-вагон | **3 240,00** | 162,00 | 324,00 |
| 47 | Автомобиль МАЗ 5336 А3, рег. № AI 6327-3, г. в. 2009, цвет – белый, тип ТС – грузовой бортовой | **14 760,00** | 738,00 | 1 476,00 |
| 48 | Автомобиль МАЗ 5551 А2 рег. № АВ 5783-3, г. в. 2008, цвет – белый, тип ТС – грузовой самосвал | **11 790,00** | 589,50 | 1 179,00 |
| 49 | Автомобиль МАЗ 5551 А2 рег. № АВ 5784-3, г. в. 2008, цвет – белый, тип ТС – грузовой самосвал | **11 790,00** | 589,50 | 1 179,00 |
| 51 | Автомобиль УАЗ 39094, рег. № ЕС7603, г. в. 2004, цвет – зеленый, тип ТС – грузовой бортовой тентовый | **3 240,00** | 162,00 | 324,00 |
| 52 | Автомобиль УАЗ 390994, рег. № АА 7153-3, г. в. 2006, цвет – зеленый, тип ТС – грузопассажирский фургон | **2 880,00** | 144,00 | 288,00 |
| 53 | Автомобиль УАЗ 390902, рег. № АЕ 3994-3, г. в. 2004, цвет – светло-серый, тип ТС – грузопассажирский вагон | **3 150,00** | 157,50 | 315,00 |
| 55 | Полуприцеп МАЗ 938662, рег. № А 2345А-3, г. в. 2008, цвет – зеленый, тип ТС – полуприцеп бортовой | **6 030,00** | 301,50 | 603,00 |
| 56 | Полуприцеп МАЗ 931010, рег. № А 2347А-3, г. в. 2008, цвет – зеленый, тип ТС – полуприцеп бортовой | **6 210,00** | 310,50 | 621,00 |
| 57 | Полуприцеп МАЗ 975800, рег. № А 3169А-3, г. в. 2008, цвет – зеленый, тип ТС – полуприцеп бортовой | **8 100,00** | 405,00 | 810,00 |
| 58 | Прицеп МАЗ 837810-(042), рег. №1988 АА-3, г. в. 2009, цвет – серый, тип ТС – прицеп бортовой | **5 760,00** | 288,00 | 576,00 |
| 59 | Прицеп МАЗ 8571, рег. № А 2334А-3, г. в. 2008, цвет – серый, тип ТС – прицеп самосвал | **4 950,00** | 247,50 | 495,00 |
| 60 | Прицеп МАЗ 8571, рег. № А 2335А-3, г. в. 2008, цвет – светло-серый, тип ТС – прицеп самосвал | **4 950,00** | 247,50 | 495,00 |
| 61 | Автомобиль УАЗ 3303, рег. № ЕС 7443, г. в. 1994, цвет – серый, тип ТС – грузовой бортовой тентовый | **2 610,00** | 130,50 | 261,00 |
| 62 | Кран башенный МСК 10-20, 1982 г. в., зав. № 153, инв. № 415, рег. номер 8982, грузоподъемность 12,5 т. Недвижимые улучшения – сооружение инв. № 979 (наименование – ограждение подкрановых путей) | **12 456,00** | 622,80 | 1 245,60 |
| 63 | Комплекс мобильный агрегатированный «МАК-Бетон» СМБ-004ЕК | **34 740,00** | 1 737,00 | 3 474,00 |
| 64 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-16612**, общей площадью **24,9 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание контрольно-пропускного пункта. Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7, участок № 1. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340800000001000009** общей площадью **0,0344 га (право постоянного пользования)** | **5 130,00** | 256,50 | 513,00 |
| 65 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-16609**, общей площадью **1 339,4 кв. м,** назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **одноэтажное кирпичное, с двумя кирпичными пристройками, здание гаража на восемь транспортных единиц. Капитальное строение с инв. № 320/С-16605**, общей площадью **357,5 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание механических мастерских. Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7, участок № 3. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321850100001003854** общей площадью **0,9337 га (право постоянного пользования)** | **346 500,00** | 17 325,00 | 34 650,00 |
| 66 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-16611**, общей площадью **62,7 кв. м,** назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – **автозаправочный пункт, состоящий из одноэтажного кирпичного здания операторской и восьми стальных емкостей общим объемом V=350 т топлива, находящихся на бетонной площадке. Капитальное строение с инв. № 320/С-16615**, общей площадью **347,5 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное, с кирпичной пристройкой, здание банно-прачечного комбината. Капитальное строение с инв. № 320/С-16613**, общей площадью **403,7 кв. м,** назначение – здание специализированное для производства строительных материалов, наименование – **здание растворобетонного узла. Капитальное строение с инв. № 320/С-16607**, общей площадью **54,6 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **здание склада цемента. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 19В/7. **Капитальное строение с инв. № 320/С-16608**, общей площадью **387,9 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное, с дощатой пристройкой, здание склада с пристроенным навесом.** Недвижимые улучшения – сооружение инв. № 067 (наименование – артезианская скважина). Инженерные сети – воздушные линии электропередачи ВЛ-0,4, инв. № 391. Инженерные сети – канальная линия электропередачи, инв. № 402. Инженерные сети – Водопроводная сеть с инв. № 899. Недвижимые улучшения – Сооружение инв. № 364 (наименование – водонапорная башня). Недвижимые улучшения – сооружение инв. № 068 (наименование – ограждение территории (забор). **Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7, участок № 4. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321850100001003855,** общей площадью **2,8275 га (право постоянного пользования). Капитальное строение с инв. № 320/С-25866**, общей площадью **50,5 кв. м,** назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – **трансформаторная подстанция № 727. Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7/1. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321850100001001491** общей площадью **0,0114 га (право постоянного пользования). Целевое назначение земельного участка:** земельный участок для обслуживания трансформаторной подстанции № 727 | **180 459,00** | 9 022,95 | 18 045,90 |
| 67 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-16671**, общей площадью **504,2 кв. м,** назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – **здание лесоцеха. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, д. 7Д/2. **Капитальное строение с инв. № 320/С-16668**, общей площадью **475,5 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное панельное, с каркасно-засыпной отапливаемой пристройкой, здание цеха по изготовлению щитовых домиков. Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7А. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321850100001003798** общей площадью **0,9625 га (право постоянного пользования)** | **81 900,00** | 4 095,00 | 8 190,00 |
| 68 | **Капитальное строение с инв. № 320/С-16670**, общей площадью **2 822,6 кв. м,** назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – **одноэтажное кирпичное здание столярного цеха с двумя отдельно расположенными бытовыми помещениями и навесом для хранения готовой продукции. Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7А. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340800000001000107** общей площадью **1,0320 га (право постоянного пользования).** Котел водогрейный МИР-95 (инв. № 823) | **212 283,90** | 10 614,20 | 21 228,39 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 9 ноября 2018 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 22 ноября 2018 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 5 (пять) дней до его проведения.**

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст.127–129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 14.08.2018 г. № 154 (28770). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень



**АВЕН.** Зоркі абяцаюць вам прыліў энергіі і жыццярадасны настрой. На гэтым фоне і дзелавыя пытанні будуць паспяхова вырашацца. У панядзелак будзьце гатовыя да таго, што вашы планы могуць парушыцца. У сераду не выключаны канфлікты з найбліжэйшым акружэннем, выкліканыя вашым жаданнем раздаваць указанні. У пятніцу варта адпачыць і расслабіцца ў кампаніі блізкіх сяброў. У выхадныя можна звяртацца па падтрымку, у тым ліку і фінансавую.



**ЦЯЛЕЦ.** Важна не адхіляцца ад намечанага і праверанага курса. Калі не будзеце ленавацца, то зможаце дасягнуць блізкучых вынікаў. Аўторак — неспрыяльны для прасоўвання па кар'ернай лесвіцы. У чацвер і пятніцу можаце давесці да завяршэння важны праект, аднак эмацыянальна выматаецеся. У суботу лепш не планаваць сур'ёзных спраў. Дапамажыце сваім блізкім у пытаннях, якія іх вельмі хвалююць, гэтым вы ўмацуеце свой аўтарытэт.



**БЛІЗНЯТЫ.** На гэтым тыдні давядзецца шмат і інтэнсіўна працаваць, але праекты будуць цікавыя, і вы амаль адразу ўбачыце, што ў вас усё атрымліваецца і вы рухаецеся ў правільным кірунку. Эмацыянальнае напружанне спадзе да серады. Другая палова тыдня акажацца спакайнейшай. Магчымы цікавыя сустрэчы і карысныя знаёмствы, любоўныя спатканні і прыемныя сяброўскія стасункі.



**РАК.** Уменне слухаць і чуць прынясе поспех. У панядзелак будзьце надзвычай уважлівыя, сачыце за кожным сказаным словам. Падчас працы з дакументамі праявіце засяроджанасць, гэта станоўча адаб'ецца на кар'еры. У чацвер пастарайцеся аб'ектыўна ацаніць свае сілы і адмовіцца ад перапрацовак. У пятніцу лепш не спрачацца з начальствам. Сваякі дапамогуць вырашыць многія вашы праблемы. У асабістым жыцці чакайце прыемных сюрпрызаў.



**ЛЕЎ.** Настройцеся на сур'ёзныя і рашучыя дзеянні, але ўлічыце, што безразважная рызыка можа загубіць усе вашы пачынанні на корані. Калі будзеце прасоўвацца ў правільным напрамку, то навакольныя будуць ва ўсім падтрымліваць і справы пойдуць як па масле. У сераду можаце атрымаць добрыя весткі, вам будзе шанцаваць на прыемныя і карысныя знаёмствы. Да канца тыдня знікнуць практычна ўсе праблемы. Аднак важна не расслабляцца.



**ДЗЕВА.** Спрыяльна завершацца сустрэчы і нарады, вы будзеце вызначацца красамоўствам. У выніку атрымаеце ўплывовенасць у заўтрашнім дні і неабходную дапамогу з боку сяброў і знаёмых. Аднак магчымы невялікія грашовыя страты. У пятніцу імпульсіўнасць і ўпартасць пагражаюць пасварыць з блізкімі людзьмі. У нядзелю вам могуць прад'явіць неабгрунтаваныя прэтэнзіі. Будзьце дыпламатычныя, і тады пазбегнеце наступстваў гэтага канфлікту.



**ШАЛІ.** Ваш асабісты поспех будзе залежаць ад ступені вашай бескарыслівасці ў адносінах з навакольнымі. Чым менш будзеце думаць пра сябе, тым больш атрымаеце. Не саромейцеся дэманстраваць свой інтэлект. Паспрабуйце не спазняцца на працу і на дзелавыя сустрэчы. У чацвер магчымы даволі стомныя далёкія паездкі. У пятніцу з'явіцца магчымасць высветліць важныя нюансы асабістых адносін.



**СКАРПІЁН.** На гэтым тыдні асабліва ўдачлівыя будуць тыя, хто праявіць упартасць у пошуку новых сфер для прымянення сваіх талентаў. Усё абавязкова атрымаецца, вы на правільным шляху, і жыццё пацверджвае гэта ўжо да канца тыдня. Хоць будзьце гатовыя абысціся без шкадаванняў, што ў вас занадта шмат спраў і мала вольнага часу. Затое атрымаецца вырашыць усе фінансавыя пытанні. Прафесійныя справы ідуць угару.

У выхадныя дні паспрабуйце стварыць дома максімальна гарманічную атмасферу.



**СТРАЛЕЦ.** Наступны тыдзень запатрабуе асцярожнасці ў думках і дзеяннях. Калі, вядома, вы не хочаце, каб вашы тайны адкрыліся для ўсеагульнага агляду, трымайце язык за зубамі. Адной з самых напружаных праблем тыдня могуць стаць узаемаадносіны са старымі сябрамі і жонкай ці мужам. У чацвер лепш пазбягаць людных месцаў і лішніх размоў.



**КАЗЯРОГ.** Многае будзе атрымлівацца, асабліва калі сумяшчаць прыемнае з карысным. Дзякуючы таварыскасці і дыпламатычнасці здолееце наладзіць патрэбныя сувязі ў дзелавой і асабістай сферах. Больш беражліва і ўважліва пастаўцеся да сям'і. У чацвер магчыма напружаная сітуацыя на працы, таму гэты дзень лепш прысвяціць завяршэнню дробных спраў і не пачынаць нічога новага. У выхадныя пастарайцеся выспацца і адпачыць.



**ВАДАЛІЎ.** Тыдзень абяцае поспех у справах кар'еры. Каб не прапусціць гэтыя прыемныя і доўгачаканыя хвіліны, нельга губляць час дарма, выявіце максімум працавітасці. Магчыма, давядзецца змяніць кола знаёмых. Серада ўдалая для паездак і падарожжаў. У чацвер магчымая сітуацыя, калі давядзецца абараняць свае інтарэсы. У суботу ёсць імавернасць нечаканых падзей, якія зменяць асабістае жыццё ў лепшы бок.



**РЫБЫ.** Гэта зорны час для людзей дзелавых, тых, хто не баіцца браць адказнасць на сябе. Менавіта цяпер вы можаце раскрыць свой творчы патэнцыял і ўмацаваць матэрыяльнае становішча. Магчымы некаторыя ўскладненні і перашкоды ў дасягненні мэты ў аўторак. У суботу ваша дапамога і падтрымка будуць неабходныя радні. Нядзелю прысвяціце свайму адпачынку, а не арганізацыі чагосьці.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.25 | 17.21 | 8.56 |
| Віцебск — | 8.19 | 17.06 | 8.47 |
| Магілёў — | 8.15 | 17.11 | 8.56 |
| Гомель — | 8.06 | 17.13 | 9.07 |
| Гродна — | 8.39 | 17.37 | 8.58 |
| Брэст — | 8.34 | 17.43 | 9.09 |

## Месяц

*Маладзік 7 лістапада.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

***Пр.*** *Аляксандры, Елізаветы, Капіталіны, Андрэя, Маркі, Несцера.*
***К.*** *Аляксандра, Анатоля, Людвіка, Тодара, Урсына.*



Фота Андрэя САЗОНАВА.

# ЗАЎТРА




**Даты** **Падзеі** **Людзі**

**9 ЛІСТАПАДА**



У краіне

**1902** год — нарадзіўся (в. Вешкі, цяпер у Докшыцкім раёне) Несцер Фёдаравіч Сакалоўскі, беларускі кампазітар, хормайстар, фалькларыст. З 1926 года акцёр і хормайстар БДТ-3. У 1937—1941 гадах адзін з арганізатараў і хормайстар Ансамбля беларускай народнай песні і танца Беларускай філармоніі, з 1944-га — ва Упраўленні па справах мастацтваў пры СНК БССР. Аўтар музыкі Дзяржаўнага гімна БССР (словы М. Клімковіча), хораў, песень на вершы Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, А. Русака, інструментальных мініяцюр, вакальных сюіт на тэмы беларускіх народных песень, апрацовак беларускіх народных песень (больш за 500) і найгрышаў. Памёр у 1950 годзе.



**1941** год — за 10 км ад Мінска для масавага знішчэння цывільнага насельніцтва і савецкіх ваеннапалонных, палітвязняў нямецкіх турмаў і лагераў, яўрэяў з Аўстрыі, Германіі, Польшчы, Чэхаславакіі нацыстамі быў арганізаваны Трасцянецкі лагер смерці. Па колькасці знішчаных ахвяр ён з'яўляўся самым буйным на тэрыторыі былога СССР і чацвёртым у Еўропе ў сістэме нацысцкіх лагераў смерці пасля Асвенцыма, Майданэка і Трэблінкі. Масавыя расстрэлы праводзіліся ва ўрочышчах Благаўшчына і Шашкоўка. З лістапада 1941-га да кастрычніка 1943 года тут было забіта каля 150 тысяч чалавек.



У свеце

*Міжнародны дзень барацьбы з фашызмам і антысемітызмам. Адзначаецца па ініцыятыве ААН, ЮНЕСКА, Савета Еўропы і міжнародных еўрапейскіх арганізацый. У ноч з 9 на 10 лістапада 1938 года адначасова ў Германіі і Аўстрыі пачаліся масавыя яўрэйскія пагромы, арганізаваныя кіраўніцтвам нацысцкай партыі (Крыштальная ноч).*

**1818** год — нарадзіўся Іван Сяргеевіч Тургенеў (1818—1883), рускі пісьменнік, член-карэспандэнт Пецярбургскай АН. Значную частку жыцця правёў за мяжой. У 1870-я гады, жывучы ў Парыжы, зблізіўся з дзеячамі народніцкага руху, матэрыяльна дапамагаў народніцкаму часопісу «Вперед». Уваходзіў у гурток найбуйнейшых французскіх пісьменнікаў — Г. Флабера, Э. Заля, А. Дадэ, братоў Ганкур. У 1879 годзе Оксфардскі ўніверсітэт прысвоіў яму ступень доктара звычайнага права. Аўтар цыкла нарысаў «Запіскі паляўнічага», аповесці «Муму», раманаў «Рудзін», «Дваранское гняздо», «Напярэдадні», «Бацькі і дзеці» і іншых. Яго імем названы вуліцы ў гарадах Баранавічы, Барысаў, Брэст, Віцебск, Гомель.

**1929** год — нарадзілася Аляксандра Мікалаеўна Пахмутава, савецкі і расійскі кампазітар, народная артыстка СССР, Герой Сацыялістычнай Працы. Вядомая як кампазітар-песеннік. Аўтар балета «Азоранасць», кантаты «Васіль Цёркін», уверцюр, канцэртаў для аркестра, музыкі да драматычных спектакляў, кінафільмаў, радыёпастановак і інш. Сярод вядомых песень на музыку Пахмутавай: «Геолагі», «Абдымаючы неба», «Пяшчота», «Мелодыя», «Белавежская пушча», «Беларусь». Двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

## УСМІХНЕМСЯ

**Раніцай трэба быць асабліва асцярожным. Адзін неасцярожны рух — і ты ўжо спіш.**

— Вова, ты карміў ката, калі мяне не было?
— Так, з ім усё ў парадку!
— А рыбак?
— Э-э-э, гэта быў няпросты выбар...

**Нявеста на вяселлі зразумела, што госці яе недалюбліваюць, калі кінуты букет прыляцеў ёй назад у спіну.**

Фатограф — фатографу:
— У цябе на здымках няма ніводнага чалавека з заплюшчанымі вачыма. Як табе гэта ўдаецца?!
— Калі я наводжу на кліентаў фотаапарат, то раптам выкрыкваю: «Кожны здымак каштуе сто рублёў!»

**З ліста ў газету:**
**«У мяне канфіскавалі самагонны апарат. Ці магу я атрымаць кампенсацыю ў сувязі са стратай карміцеля?»**




caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.



http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by



Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4163.

Нумар падпісаны ў 19.30 8 лістапада 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

9 лістапада 2018 г. № 45 (478)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ



**Увага!**

**Адкрыта асобная падпіска на пятнічны нумар газеты «Звязда» з дадаткам «Мясцовае самакіраванне» (выходзіць штотыднёва).**

Для фізічных асоб – 633072
Для юрыдычных асоб – 63307

**Аформіць падпіску можна на тэрмін ад аднаго месяца да паўгода.**


ТЭМА ТЫДНЯ



Фота БелТА.

# НОВЫЯ ПРАВІЛЫ ГУЛЬНІ

## ДЛЯ СПАЖЫЎЦОЎ І ПРАДАЎЦОЎ

**З 23 снежня ўступаюць у сілу змяненні ў законе «Аб абароне правоў спажыўцоў». Ці з'явіцца на этыкетках беларуская мова? У якіх выпадках прадавец зможа павялічыць тэрмін гарантыйнага рамонту? Ці будуць выдаваць рэшту з падарункавага сертыфіката? Мы паглядзелі, якія наваўвядзенні чакаюць спажыўцоў, а таксама даведаліся, з якімі праблемамі часцей сутыкаюцца пакупнікі і што рабіць, калі вытворца адмаўляецца прызнаваць дэфект тавару.**

### Цану прапішуць чытэльным шрыфтам

Якія ж змяненні ўвайшлі ў закон? Так, на таварах абавязкова змяшчаць інфармацыю аб краіне іх паходжання, калі яна не супадае з адрасам вытворцы, і аб класе энергаэфектыўнасці (напрыклад, у маркіроўцы халадзільнікаў, пральных і пасудамыечных машын).

Прадаўцы, якія рэалізуюць тавар дыстанцыйна праз рэкламу ці інтэрнэт, мусяць указваць цану шрыфтам, памер якога павінен быць не меншым за палову самага вялікага шрыфту, які ёсць у апісанні. Гэта дазволіць зрабіць інфармацыю чытэльнай, і спажывец радзей будзе памыляцца наконт кошту пакупкі.

— Значная колькасць зваротаў пры рабоце над праектам закона датычылася мовы інфармацыі. У гэтай сувязі ўлічана прапанова аб давядзенні звестак «на беларускай і (ці) рускай мовах», — каментуюць у Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю.

Замацавалі таксама права спажыўца на разлік у наяўнай і безнаяўнай форме. Пры гэтым прадаўцу забаронена ўстанаўліваць розныя цэны ў залежнасці ад формы аплаты.

стар. 4

ПАРТНЁР ТЭМЫ ТЫДНЯ:






## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### На ўзроўні нанатэхналогій



У Магілёве выпусцілі вопытны ўзор тэхвугляроду. стар. 2–3

### Старое–новае імя




У Гомелі вуліцы вярнулі дарэвалюцыйную назву. стар. 3

### «Іск адклікаем, просім прабачэння»



Якія формы можа набыць так званы спажывецкі экстрэмізм? стар. 13

### Асцярожна: лекі з інтэрнэту



Магілёўскі актывіст дапамог выкрыць ашуканскую схему продажу «пустышак». стар. 14

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Час рыхтавацца да наступнага форуму

**Адбылася тэлефонная размова старшыні Савета Рэспублікі Міхаіла Мяснiковіча і старшыні Савета Федэрацыі Валянціны Мацвіенка, паведамляе афіцыйны сайт верхняй палаты беларускага парламента.**

Па ініцыятыве старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі Валянціны Мацвіенка адбылася тэлефонная размова са старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаілам Мясніковічам па пытаннях рэалізацыі дамоўленасцяў, якія датычацца падрыхтоўкі да наступнага — VI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

Падчас размовы былі абмеркаваны напрамкі ўдасканалення супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў, а таксама некаторыя падыходы да арганізацыі будучага форуму, якія былі агучаны на папярэднім форуме, што прайшоў сёлета ў Магілёве.

Для больш дэталёвага разгляду названых пытанняў плануецца візіт кіраўнікоў і экспертаў шэрагу рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі ў Беларусь.

## Асацыяцыі мясцовых Саветаў — пільная ўвага

**У Савеце Рэспублікі абмеркавалі пытанні дзейнасці асацыяцый мясцовых Саветаў дэпутатаў.**



У аўторак, 6 лістапада, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр Папкоў правёў нараду з удзелам дырэктара Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Вадзіма Іпатава, першага намесніка міністра юстыцыі Сяргея Задзірана, намесніка міністра фінансаў Дзмітрыя Кійко, першага прарэктара Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Валерыя Барадзені і іншых.

Падчас мерапрыемства абмяркоўваліся некаторыя аспекты стварэння асацыяцый мясцовых Саветаў дэпутатаў і Нацыянальнай асацыяцыі. Адзначана неабходнасць дадатковай прапрацоўкі механізмаў павышэння эфектыўнасці дзейнасці гэтых фарміраванняў па рашэнні праблемных пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва, ажыццяўлення імі міжнароднага супрацоўніцтва і іншых тэм.

## Для глабальнага гандлю і нацыянальнай эканомікі

**У пачатку тыдня старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір Панцюхоў прыняў удзел у канферэнцыі ў рамках Кастрычніцкага эканамічнага форуму.**

На канферэнцыі, якая праходзіла 5—6 лістапада, абмяркоўваліся наступствы гандлёвых канфліктаў паміж ЗША і іх асноўнымі гандлёвымі партнёрамі для глабальнага гандлю і эканомікі Рэспублікі Беларусь у прыватнасці, а таксама вынікі рэформаў, якія праводзяцца ў краіне.

У мерапрыемстве таксама ўдзельнічалі міністр гандлю і антыманапольнага рэгулявання Уладзімір Калтовіч, першы намеснік міністра замежных спраў Андрэй Еўдачэнка, кіраўнік прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі Андрэа Віктарын, пастаянны каардынатар ААН, пастаянны прадстаўнік ПРААН у Беларусі Іаана Казана-Вішнявецкі, саветнік Выканаўчага дырэктара МВФ Аляксандр Забароўскі і іншыя.

Некалькімі днямі раней член Прэзідыума Савета Рэспублікі Уладзімір Панцюхоў прыняў удзел у пашыраным пасяджэнні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, на якім разглядаліся пытанні «Аб выніках рэалізацыі грашова-крэдытнай палітыкі за студзень — верасень 2018 года» і «Аб ходзе рэалізацыі стратэгічнага праекта Нацыянальнага банка «Стварэнне сістэм маніторынгу і процідзеяння камп'ютарным нападам у крэдытна-фінансавай сферы».

# НА ЎЗРОЎНІ

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл Мясніковіч наведаў у Магілёве інавацыйную вытворчасць — ЗТАА «Омск Карбон Магілёў», дзе яму прадэманстравалі доследны ўзор атрыманага тут тэхнічнага вугляроду.**

Прадукты, якія афіцыйна кваліфікаваны ў Еўрасаюзе як нанапрадукт. Пакуль на прадпрыемстве вядуцца пусканаладачныя работы, але якасць першых 38 тон тэхнічнага вугляроду, якія атрыманы пры наладцы абсталявання, спецыялісты ацэньваюць вельмі высока.

— Мы можам смела заявіць, што прадпрыемства працуе, і мы гатовыя забяспечыць высокаканкурэнтнай прадукцыяй усе сучасныя вытворчасці, у тым ліку нашага галоўнага партнёра — «Белшыну», — адзначыў **старшыня савета дырэктараў ТАА «Омсктэхвугляррод» Валерый КАПЛУНАТ.**

Прадукцыя з'яўляецца экспартаарыентаванай і імпартазамяшчальнай, да 30 % плануецца пастаўляць на «Белшыну» ў Бабруйск. Дарэчы, патрэбы гэтага прадпрыемства ў тэхвугляродзе складаюць 60 тысяч тон у год. Магутнасці ж новага вытворцы разлічаны на выпуск 200 тысяч тон прадукцыі ў год. З наступнага года прадпрыемства ўжо пачне нарошчваць тэмпы і хутка зможа цалкам вырашыць імпартную залежнасць краіны ў тэхвугляродзе, без якога, як вядома, немагчыма вытворчасць шын, гумава-тэхнічных вырабаў, пластыкаў, палімераў, штучных валокнаў.

Тэхнічны ўзровень прадпрыемства ўражвае. Дастаткова пабываць у лабараторыі па кантролі якасці, якая працуе ў адпаведнасці з міжнароднымі патрабаваннямі. Высокая дакладнасць дасягаецца за кошт сучаснага высокатэхналагічнага абсталявання, вымярэнні вядуцца ў анлайн-рэжыме.

Спікер беларускага парламента падкрэсліў, што «Омск Карбон Магілёў» — суперінавацыйнае прадпрыемства, якое адкрывае новыя магчымасці для беларускай эканомікі:

— Гэта пяты тэхналагічны ўклад, хацелася б, каб такіх прадпрыемстваў было як мага болей. Мы можам казаць пра нанатэхналогіі на гэтым прадпрыемстве і атрымліваць адмысловыя дабаўкі для лакафарбавай прамысловасці, цэментнай прамысловасці, асфальтабетонаў непасрэдна як нанаструктуры. Дзяржаўная праграма, якая была прынятая па інавацыйным развіцці на 2016—2020 гады, магла быць больш амбіцыйнай. Ёсць думкі пра тое, як стымуляваць і матываваць вытворчасць. Тут патрэбны новыя падыходы, і адзін з іх — спецінвестkантракт, калі дзяржава разам з вытворцамі і навукай бярэ пэўныя рызыкі, мінімізуе іх для таго, каб вывесці цалкам новы тавар на рынак.

Пакуль на прадпрыемстве працуе каля 200 чалавек, але ў будучыні колькасць павялічыцца да 450 работнікаў. Начальнік службы кіравання персаналам Святлана Баброва працуе на прадпрыемстве з лютага. Яна кажа, што перад тым, як працаўладкавацца, яна прайшла сур'ёзны іспыт на адпаведнасць прафесіі. Зараз востра стаіць патрэба ў спецыялістах, якіх дэфіцыт у краіне: апаратчыкаў для атрымання тэхвугляроду, апаратчыкаў ушчыльнення тэхвугляроду. І прадпрыемства рыхтуе іх пакуль з дапамогай вучэбнага цэнтра ЖКГ.

Падчас знаёмства з новай вытворчасцю Міхаіл Мясніковіч таксама закрануў тэму падрыхтоўкі кадраў:

— Прадпрыемства высокатэхналагічнае, навукаёмістае, шмат у чым больш канкурэнтаздольнае, чым аналагічныя прадпрыемствы заходніх кампаній. Зараз ідзе падбор кадраў і трэба на базе Беларускага тэхналагічнага і магілёўскага Беларуска-Расійскага ўніверсітэтаў рыхтаваць сваіх інжынерна-тэхнічных спецыялістаў. Неабходна асвойваць новы напрамак развіцця прамысловасці Беларусі.



Старшыня Савета Рэспублікі наведаў у Магілёве яшчэ адно арыентаванае на інавацыі прадпрыемства — ААТ «Магілёўхімвалакно». Ён лічыць, што ў айчыннай хімічнай галіны добрая перспектыва:

— Тыя вырабы, якія рабіліся калісьці, ужо неканкурэнтаздольныя. Калі не займацца сур'ёзна хімічнымі валокнамі, мы можам страціць гэтую галіну. Мы пакуль ствараем толькі адно звяно ў складаным ланцужку хімічнага сінтэзу. Тое, што робіцца на «Магілёўхімвалакне», цудоўна. Гэта высокаканкурэнтная вытворчасць, якая будзе забяспечваць і Светлагорск, і сябе новай прадукцыяй і, безумоўна, пастаўляць яе на экспарт. Але гэтага недастаткова. Павінен быць нацыянальны праект, які дазволіць ствараць шматлікія тавары хімічнага сінтэзу ў Беларусі. Для эканомікі краіны закупляецца палімераў у сярэднім на два мільярды долараў,

# Супрацоўніцтва

## Пра ўзаемадзеянне Беларусі і Японіі ішла размова падчас наведвання

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы разам з сенатарам паслом Японіі ў Рэспубліцы Беларусь Такунага Хіракі ацэньваў патэнцыял кампаніі, каб пазнаёміць японскіх бізнесменаў з беларускай прадукцыяй інавацыйнага тыпу.**



Адзначым, што раней Сяргей Рахманаў займаў пасаду Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі ў Японіі, таму добра знаёмы з патэнцыялам гэтай краіны.

Кампанія «АДАНІ» створана ў 1991 годзе. Асновай прадпрыемства паслужыла навукова-даследчая лабараторыя прафесара Уладзіміра Лінева ў Белдзяржуніверсітэце. Адной з задач на той час было захаванне навукова-тэхнічнага патэнцыялу лабараторыі ва ўмовах распаду Савецкага Саюза. Разам з тым даследчык развіваў і ўласныя напрацоўкі. На сённяшні дзень кампанія працуе ў галіне медыцынскай тэхнікі, прыборабудавання, бяспекі і неразбуральнага кантролю.

«Мы пачыналі фактычна з двух відаў прадукцыі. Яна стала актуальнай і для Японіі пасля Фукусімы. Мы распрацавалі прыбор, які вымяраў утрыманне радыенуклідаў у прадуктах харчавання, аб'ектах навакольнага асяроддзя пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС. І на працягу некалькіх гадоў кампанія зрабіла каля пяці тысяч адзінак такога абсталявання для Беларусі, Расіі і Украіны», — расказаў **генеральны дырэктар «АДАНІ» Уладзімір ЛІНЕЎ.**

Як падкрэсліў кіраўнік прадпрыемства: на сённяшні дзень кампанія мае тры класы абсталявання: серыйнае — тое, якое было створана раней, для індывідуальнага карыстання і абсалютна новае, інавацыйнае. Ён таксама заўважыў: пры сустрэчы з замежнымі партнёрамі важна паказваць, што ў кампаніі ёсць сур'ёзныя дасягненні ў галіне высокіх тэхналогій.

«Сусветная супольнасць ідэнтыфікавала час, у якім мы сёння жывём, як стагоддзе інавацый. Гэта азначае, што сёння рынак і кампанія

# НАНАТЭХНАЛОГІЙ



але тыя даследаванні, якія зрабілі нашыя вучоныя, сведчаць пра магчымасці стварэння тут сур'ёзнага імпартазамяшчэння, прыкладна працэнтаў на пяцьдзясят. Патрэбны вялікія інвестыцыі, але шмат якія дзяржавы стымулююць развіццё хіміі, каб быць самадастатковымі. І калі ўжо нешта будаваць, то не даганяючую вытворчасць, а працаваць на апярэджанне. Пры гэтым павінен быць вельмі магутны сінтэз навукі і вытворчасці. У гэтую галіну трэба актыўна ўцягваць замежных інвестараў, няхай лепей яны будуць нашымі партнёрамі, а не канкурэнтамі. У выніку мы будзем мець доступ да новых тэхналогій, рынкаў, інфармацыі.

Дарэчы, у Дзяржаўную праграму інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады ўключана 111 інавацыйных праектаў, з іх 40 заснаваныя на тэхналогіях пятага-шостага тэхналагічных укладаў. З пачатку рэалізацыі дзяржпраграмы ў краіне ўведзены ў эксплуатацыю вытворчасці па 33 праектах. Так на УП «АДАНІ» сфарміраваны інавацыйна-прамысловы комплекс высокіх тэхналогій у галіне складанай медыцынскай тэхнікі, сістэм гарантавання бяспекі, абсталявання неразбуральнага кантролю і аналітычнага прыборабудавання.

На базе ААТ «Інтэграл» — кіруючая кампанія холдынга «Інтэграл» арганізаваны новыя вытворчасці эпітаксіяльных структур і факальных плоскасцяў на аснове фотаадчувальных прыбораў з зарадавай сувяззю з часовай затрымкай іназапашваннем зараду, якія ўжываюцца айчыннымі распрацоўшчыкамі і вытворцамі ў перспектыўных спадарожнікавых сістэмах дляназірання і дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі. Інстытут мікрабіялогіі НАН Беларусі арганізаваў доследна-прамысловую вытворчасць ферментаў для сінтэзу лекавых субстанцый і атрымання найноўшых дыягностыкумаў. А ў Інстытуце хіміі новых матэрыялаў НАН Беларусі — доследную вытворчасць кампазіцыйных матэрыялаў на базе айчынных тэрмапластаў для экструзійнага 3D-друку.

Усяго 372 прадпрыемствы прамысловасці Беларусі выкарыстоўвалі летась у арганізацыі вытворчасцяў розныя тыпы інавацый.

У межах рабочай паездкі ў Магілёў Міхаіл Мясніковіч таксама ўручыў памятныя знакі работнікам і арганізацыям, якія зрабілі значны ўнёсак у падрыхтоўку і правядзенне на высокім арганізацыйным узроўні V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# як драйвер

## членам Савета Рэспублікі Сяргеем РАХМАНАВЫМ завода «АДАНІ»

сфакусаваныя на стварэнне нечага новага», — паведаміў кіраўнік прадпрыемства.

Кожны год 8,5 працэнта ад абароту кампаніі інвестуецца ў распрацоўкі. Каля 460 беларускіх клінік карыстаюцца рэнтгена-дыягнастычным абсталяваннем прадпрыемства, і гэта, як запэўніваюць тут, яшчэ не мяжа.

«Нядаўна па замове Міністэрства аховы здароўя мы сталі вырабляць тамографы. Гэта абсталяванне разлічана на паліклінікі, бальніцы, прыёмныя аддзяленні, — падзяліўся Уладзімір Лінеў, — акрамя таго, каля трох мільёнаў чалавек штогод праходзяць абследаванне на нашым абсталяванні».

Свае надзеі на развіццё вытворчасці, у тым ліку міжнароднага супрацоўніцтва, выказаў і Сяргей Рахманаў.



«Хацелася б, каб у нас была кааперацыя з передавымі краінамі ў гэтай галіне. І Японія ў гэтым сэнсе з'яўляецца фінансавым і тэхналагічным донарам. Звычайна яна разглядае партнёраў з двух пунктаў гледжання: магчымасці рынку збыту тавараў і як крыніцу сыравіны. Беларусь жа прапаноўвае трэці варыянт: каб узаемадзеянне было ў сферы інавацый для выхаду на рынкі трэціх краін. Можа быць, мы ўбачым новыя тэхналогіі ў галіне навуковых даследаванняў. Менавіта таму супрацоўніцтва з Японіяй для нас такое істотнае», — адзначыў сенатар.

Пасля невялікай экскурсіі па прадпрыемстве пасол Японіі Такунага Хірокі выказаў намер запрасіць у Беларусь японскіх бізнесменаў.

«Я ўпэўнены, што мы павінны больш ведаць аб тэхналогіях вашай краіны. Паміж намі ёсць вялікі патэнцыял, і трэба выкарыстаць яго для больш шырокага супрацоўніцтва, у тым ліку для развіцця тэхналогій, навукі і бізнесу», — падкрэсліў дыпламат.

**Ганна ЮНЧЫЦ.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# Справы мінулага і сучаснасці

## Вуліцы ў Гомелі вярнулі дарэвалюцыйнае імя...

**Гомельскі гарадскі Савет дэпутатаў прыняў рашэнне пра змену назвы вуліцы Дзям'яна Беднага на Мікольскую. Пакуль што шыльды зменены толькі на браме пры ўваходзе ў манастыр. На дамах насупраць яшчэ значыцца «вуліца Д. Беднага».**

Дарэчы, Свята-Нікольскі храм у гэтым месцы знаходзіцца больш, чым стагоддзе. Цяпер тут яшчэ і мужчынскі манастыр. Яго насельнікі нагадваюць, што імя рэвалюцыйнага паэта вуліца атрымала ў другой палове 1920-х гадоў. Мікольскай тады далі імя Дзям'яна Беднага — менавіта таму, што паэт актыўна выступаў супраць рэлігіі.

Між тым храм быў пабудаваны ў пачатку XX стагоддзя недалёка ад вакзала Палескай чыгункі. Сцвярджаюць, што благаславіў пабудову Нікольскага храма, а таксама ахвяраваў на гэтыя мэты сродкі святы Іаан Кранштацкі. Царкву будавалі з 1901 да 1904 года па праекце вядомага архітэктара Станіслава Шабунеўскага. Мікольская вуліца пачала забудоўвацца, пачынаючы ад аднайменнай царквы. Чыгуначнікі ў той час актыўна засялялі Залінейны раён. Гэтую частку горада ў народзе ведаюць пад такой назвай і сёння.




Нікольскай царкве ў Гомелі пашанцавала: яе не знеслі, як многія іншыя. Аднак у 1929 годзе храм закрылі, званіцу і купал разбурылі, а ў будынку арганізавалі склады і майстэрні. Падчас Вялікай Айчыннай вайны ён аднавіў работу і доўгі час заставаўся адзіным у абласным цэнтры, дзе ішлі набажэнствы.

> Імя рэвалюцыйнага паэта вуліца атрымала ў другой палове 1920-х гадоў. Мікольскай тады далі імя Дзям'яна Беднага — менавіта таму, што паэт актыўна выступаў супраць рэлігіі.

Дарэчы, калі абмяркоўвалася прапанова аб вяртанні гістарычнай назвы, улічваліся і меркаванні супраць. Яны былі звязаны з тэхнічнымі пытаннямі. Жыхароў супакоілі: змены ў дакументы трэба будзе ўносіць па неабходнасці іх планавай замены, а шыльды на будынках паступова заменяць камунальныя службы.

## ...і перадалі будынак для крызіснага цэнтра

Тое ж рашэнне Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў прадугледжвае бязвыплатную перадачу будынка на вуліцы Свярдлова, 21 Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа. Цяпер у доме будзе знаходзіцца крызісны цэнтр для людзей, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Размова ідзе пра сацыяльную адаптацыю былых асуджаных і асоб без вызначанага месца жыхарства.

Аднапавярховы дом плошчай 99,5 квадратнага метра Чырвоны Крыж арандуе з 1997 года. Улічваючы бездакорную рэпутацыю арандатара, улады вырашылі перадаць будынак ва ўласнасць пры ўмове размяшчэння ў ім крызіснага цэнтра. Для Гомеля гэта прэцэдэнт, бо раней вывядзенне нерухомасці са складу гарадской маёмасці праходзіла толькі праз аўкцыёны.

На перапланіроўку будынка пад патрэбы цэнтра адвялі не больш за год. Выкарыстоўваць яго па іншым прызначэнні забаронена пад пагрозай адчужэння. Курыраваць рэалізацыю праекта будзе УУС Гомельскага аблвыканкама.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# А ПАСЛЯ ПРЭЗЕНТАЦЫЙ...

**У Віцебскай вобласці за дзевяць месяцаў бягучага года ў аблвыканкаме, гарраймвыканкамах разгледжана 2252 звароты грамадзян па пытаннях абароны правоў спажыўцоў. Сярод іх 157 — у сферы гандлю і грамадскага харчавання, 54 — бытавога абслугоўвання. Для параўнання летась за гэты ж час было 1611 зваротаў (адпаведна — 256 і 73).**

Як паведамілі карэспандэнту «МС» у Галоўным упраўленні гандлю і паслуг Віцебскага аблвыканкама, па выніках разгляду вынесена 10 прадпісанняў аб ліквідацыі парушэнняў заканадаўства, складзена 22 пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Акрамя таго, у дасудовым парадку кампенсавана матэрыяльнай шкоды амаль на 5,8 тысячы рублёў.

Апошнім часам у Прыдзвінні пачасціліся выпадкі набыцця грамадзянамі на розных прэзентацыях дарагіх тавараў: ад посуду да коўдраў. Людзі пад уражаннем прадэманстраваных спажывецкіх уласцівасцяў, не задумваючыся, заключаюць дагаворы, каб набыць тавары з растэрміноўкай на буйныя сумы. Пасля нярэдка звяртаюцца па дапамогу ў скасаванні дагавора.

Дарэчы, законам «Аб абароне правоў спажыўцоў» і Грамадзянскім кодэксам вызначана, што тавары належнай якасці магчыма вярнуць на працягу 14 дзён. Вяртанне ажыццяўляецца ў месцы пакупкі ці іншым, устаноўленым прадаўцом. І тут ёсць «падвох»: дагавор на набыццё могуць заключыць на прэзентацыі ў Віцебску, а вяртанне прадугледжана па месцы знаходжання фірмы. Напрыклад, у Брэсце ці Гродзенскай вобласці. У такім выпадку пакупніку прыйдзецца за свой кошт прывезці тавар на адрас знаходжання фірмы.

Нямала прыкладаў і навязвання фірмамі паслуг па рамонце і прафілактыцы вокнаў, электраабсталявання, дыягностыцы камп'ютарнай тэхнікі і гэтак далей.

**Начальнік аддзела арганізацыі гандлю і бытавых паслуг галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Віцебскага аблвыканкама Наталля ЕЛІСЕЕВА** параіла спажыўцам наступнае. Нягледзячы на настойлівасць супрацоўнікаў фірмаў, неабходна папярэдне ўважліва азнаёміцца з дагаворам. Там павінны ўказаць аб'ём работ, кошт матэрыялаў, дэталяў і камплектуючых. Усё трэба ўважліва пачытаць і толькі пасля гэтага падпісваць.

Упаўнаважанымі па абароне правоў спажыўцоў канстатуецца, што асабліва гэта датычыцца найбольш уразлівай катэгорыі насельніцтва — людзей сталага ўзросту. Бо пасля таго, як паслуга ўжо аказана, позна задумвацца аб яе цане і ўмовах.

Патрабаванні па вяртанні грошай за аказаную паслугу абгрунтавана могуць быць прад'яўленыя спажыўцамі толькі ў тых выпадках, калі яна аказана няякасна, не ў поўным аб'ёме або не ва ўстаноўленыя тэрміны.

Іншыя пытанні, звязаныя з аднабаковым скасаваннем дамовы і вяртаннем грашовых сродкаў, вырашаюцца толькі ў судзе.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# НОВЫЯ ПРАВІЛЫ ГУЛЬНІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й «МС».)***

Пры звароце пакупніку грошай у яго не павінны будуць патрабаваць пашпарт ці іншы дакумент, які сведчыць асобу. Спажывец зможа таксама адмовіцца ад дагавора аб выкананні работы (паслугі), але ў такім выпадку яму давядзецца аплаціць выканаўцу фактычна панесеныя расходы.

Улічваліся ў законе і прапановы бізнес-супольнасці. У прыватнасці, вярнуць ці замяніць тэхнічна складаныя і дарагія тавары пасля таго, як прайшло 30 дзён пасля пакупкі, можна будзе толькі ў двух выпадках: калі выявіўся істотны недахоп ці калі прадавец парушыў тэрміны бясплатнага рамонту.

Дазваляецца таксама з пісьмовай згоды спажыўца павялічваць тэрмін гарантыйнага рамонту з 14 да 30 дзён. «Папраўка абумоўлена выпадкамі аб'ектыўнай неабходнасці, напрыклад у сувязі з дазаказам камплектуючых, запасных частак, патрабаваннямі аб правядзенні рамонту на абсталяванні вытворцы ці яго ўпаўнаважаных асоб, якія знаходзяцца далёка», — тлумачаць у міністэрстве.

Рамонтныя арганізацыі абавяжуць правяраць якасць дастаўленага ім прадаўцамі тавару ў трохдзённы тэрмін. Калі спажывец не забірае тавар пасля двух месяцаў з моманту экспертызы ці бясплатнага рамонту без уважлівай прычыны, з яго маюць права спагнаць выдаткі за захаванне рэчы. А вяртаць якасны тавар трэба будзе ва ўпакоўцы, у якой яго прадалі.

## Сертыфікат можна будзе вярнуць

Некаторыя моманты дагэтуль абмяркоўваюцца. Напрыклад, правілы дзеяння падарункавых сертыфікатаў — сёння яны выклікаюць шмат спрэчак. У праекце пастановы Савета Міністраў «Аб некаторых мерах па абароне правоў спажыўцоў» прадугледжваецца, што сертыфікат можна будзе вярнуць на працягу 14 дзён з моманту яго пакупкі. Калі за яго разлічваліся ў безнаяўнай форме, то спажыўцу, які прад'явіць падарункавы дакумент, вернуць грошы на яго рахунак.

Прадавец не будзе мець права ўстанаўліваць умовы рэалізацыі тавараў ці аказання паслуг, якія абмяжоўваюць тэрмін дзеяння сертыфіката, а таксама патрабаваць ад спажыўца нейкіх дадатковых дзеянняў для атрымання падарунка. Пры продажы такога дакумента абавязаны будуць выдаваць чэк.

Ніякіх даплат за паслугі і тавары, прапісаныя ў сертыфікаце, з вас патрабаваць не змогуць. А калі кошт гэтых паслуг і тавараў на момант атрымання спажыўцом знізіўся, яму павінны будуць даць рэшту. Тое ж самае і з сертыфікатамі на пэўную суму: можна будзе патрабаваць рэшту, калі не патраціў гэту суму цалкам.

Прадаўцу дазволяць працягваць тэрмін дзеяння падарункавага дакумента.

Пераглядаецца таксама пералік непрадуктовых тавараў належнай

> Пашыраецца спіс тэхнічна складаных тавараў бытавога прызначэння, якія нельга вярнуць, калі яны не маюць дэфектаў. У расійскім законе ёсць «перыяд ахалоджвання»: калі спажывец набыў халадзільнік ці пліту, ён пяць-сем дзён прызвычайваецца да рэчы, глядзіць, ці падыходзіць гэта яму ці не. На жаль, такая норма ў беларускім законе не прынята. Яна не прайшла з-за ціску бізнесу.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

якасці, якія не падлягаюць абмену і звароту ў 14-дзённы тэрмін. Яго прапануюць пашырыць: уключыць туды ветэрынарныя сродкі, тавары для прафілактыкі і лячэння захворванняў у хатніх умовах (медыцынскія прылады і інструменты, кантактныя лінзы, прадметы па доглядзе за дзецьмі), вадкасць для электронных парагенератараў.

— Заклапочанасць выклікае, што пашыраецца спіс тэхнічна складаных тавараў бытавога прызначэння, якія нельга вярнуць, калі яны не маюць дэфектаў, — дзеліцца **старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Ганна СУША.** — У расійскім законе ёсць «перыяд ахалоджвання»: калі спажывец набыў халадзільнік ці пліту, ён пяць-сем дзён прызвычайваецца да рэчы, глядзіць, ці падыходзіць гэта яму ці не. На жаль, такая норма ў беларускім законе не прынята. Яна не прайшла з-за ціску бізнесу.

На думку Ганны Сушы, варта было б яшчэ дапрацаваць артыкул 12 Закона «Аб абароне правоў спажыўцоў». А менавіта пункт пра тавары, якія наносяць шкоду маёмасці, здароўю і навакольнаму асяроддзю. Закон прадпісвае, што вытворца павінен зняць такую прадукцыю з рэалізацыі і адклікаць ад спажыўца, але сам механізм, як гэта будзе адбывацца, пакуль не вызначаны. З-за гэтага і ўзнікнуць праблемы.

— Падчас нашага грамадскага нагляду мы ўбачылі, што тавары з рэестра небяспечнай прадукцыі працягваюць рэалізоўвацца ў гандлёвай сетцы, — адзначае старшыня таварыства.

## Навязлівы сервіс і сумнеўныя вытворцы

Самай частай праблемай, з якой сутыкаюцца спажыўцы, застаецца навязванне тавараў і паслуг — запрашэнні праз званкі на прэзентацыю посуду, пасцельнай бялізны.

— Там мастацтва прадаваць наладжана вельмі добра, і людзі, не задумваючыся, заключаюць дагаворы растэрміноўкі і набываюць рэчы. І толькі потым пачынаюць разумець, што зрабілі. Асабліва ў такія сітуацыі трапляюць пенсіянеры і інваліды — ААН вылучае іх як групу ўразлівых спажыўцоў, — дзеліцца Ганна Суша.

Яна расказвае, што цяпер, акрамя фільтраў і новых акон, дакучліва прапануюць абслугоўванне камп'ютараў. Абыходзяць кватэры і ўгаворваюць хатніх гаспадынь пагаджацца на гэту паслугу, якая каштуе 600 рублёў.

Як змагацца з такім сэрвісам? Варыянт адзін — спажывец павінен навучыцца казаць «не».

Бо тыя ж мыйныя пыласосы, набытыя на прэзентацыі ў растэрміноўку, не ўдасца вярнуць прадаўцу, таму што гэта тэхнічна складаны тавар.

У выпадку калі прадукцыя бракаваная, а ў краме адмаўляюцца гэта прызнаваць, праводзіцца экспертыза. Па законе яе мусіць аплачваць прадавец. Але на практыцы адбываецца інакш. Калі пакупнік зацікаўлены ў экспертызе, ён робіць яе за свой кошт, і калі выяўляецца вытворчы дэфект, то прадавец кампенсуе кошт тавару і іншыя выдаткі (у тым ліку транспартныя).

Праводзяць экспертызу тэхнолагі і таваразнаўцы. Пры ацэнцы таго ж абутку яны могуць дакладна сказаць, парваўся ён з-за няякаснага матэрыялу ці з-за асаблівасцяў ступні і няправільна падабранага памеру. Працэдура гэта каштуе ад 118 рублёў. Але на яе прыносяць і танныя тавары.

— Звяртаюцца, як правіла, тыя пакупнікі, каго вельмі пакрыўдзілі. У нас была жанчына, якой прадавец сказала: «Вы ў гэтым паліто спалі, таму яно і мае такі выгляд». Часта звяртаюцца па мэблі, устаноўцы дзвярэй, абутку, адзенні, — пералічвае **эксперт Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Наталля КУПРЭВІЧ.**

Людзі сталі больш ведаць пра свае правы, мяркуе Ганна Суша. Яшчэ ў 2000 годзе таварыства распрацавала вучэбны дапаможнік «Асновы спажывецкіх ведаў» — такі прадмет у выглядзе факультатыву выкладаецца ў школах. Але не ўсе адносіны куплі-продажу падпадаюць пад закон «Аб абароне правоў спажыўцоў». Напрыклад, калі вы набылі рэч на інтэрнэт-пляцоўцы ў фізічнай асобы, то тут гэты дакумент не працуе.

— Вельмі асцярожна трэба ставіцца да пакупак. Варта паглядзець спачатку, як даўно вытворца прысутнічае на рынку. Бо бывае так: прадпрымальнік атрымаў пасведчанне аб рэгістрацыі, прывёз тавар, распрадаў і прыпыніў сваю дзейнасць. Тады прад'явіць прэтэнзію па якасці няма каму, — перасцерагае старшыня таварыства. — Перш чым дастаўваць кашалёк, палічыце хоць бы да пяці і падумайце: а ці патрэбны вам гэты тавар?

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

### ❍ Толькі лічбы

Летась упаўнаважаныя па абароне правоў спажыўцоў пры раённых адміністрацыях Мінска разгледзелі 3880 пісьмовых зваротаў. З іх 1120 прыпадала на гандаль (а 37 працэнтаў ад гэтай колькасці — на інтэрнэт-гандаль). Плюс былі дадзены кансультацыі па больш чым 12 тысячам зваротаў. Часцей за ўсё (у 50 працэнтах выпадкаў) у пакупнікоў узнікалі пытанні па рэалізацыі няякасных тавараў. 40 працэнтаў зваротаў датычыліся дрэнна аказаных паслуг. У выніку спажыўцам кампенсавалі матэрыяльную шкоду на суму 22 тысячы рублёў.

Некаторыя спрэчкі вырашаліся праз суд — так, летась было пададзена 65 іскаў. Пасля разгляду спраў грамадзянам вярнулі грошы за няякасныя тавары і паслугі ў памеры 81 тысячы рублёў. Таксама з адказчыкаў спагналі штрафы ў мясцовы бюджэт — усяго 68 тысяч рублёў.

# ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 75

У пачатку кастрычніка ў пасёлку Харынец-Здруй (Польшча) праходзіў маладзёжны камандны чэмпіянат свету па шашках-100.

Вызначыліся беларускія зборныя. Дзяўчаты (Яна Якубовіч, Яна Лазовік, Вікторыя Нікалаева) занялі другое месца. Юнакі (Міхаіл Семянюк, Іван Трубнікаў, Георгій Выдзерка) заваявалі бронзавыя медалі. Лідар каманды Міхаіл Семянюк паказаў абсалютна найлепшы вынік сярод усіх удзельнікаў.

У першыя выхадныя кастрычніка ў Стоўбцах прайшоў рэспубліканскі турнір па шашках-64 «Дружба». Пераможцам выйшаў майстар спорту з Маладзечна Аляксандр Барташ, другім фінішаваў майстар Вячаслаў Палянскі (Мінск), на трэцім месцы кандыдат у майстры Аляксандр Аніська (Слонім). У жаночым заліку першае месца ў майстра Марыны Навіцкай (Мар'іна Горка).

Для самастойнага рашэння прапануюцца камбінацыі, складзеныя украінскім шашачным кампазітарам У. Кручковым (г. Кагарлык, Кіеўская вобласць).

**№ 75**




**Белыя простыя шашкі:** b6, c5, c7, e5, e7, f6, h6 (7)
**Чорныя простыя шашкі:** a3, a7, b2, b4, d8, e3, g3, h8 (8)

**№ 76**

**Белыя простыя шашкі:** 23, 24, 28, 30, 32, 38, 41 (7)
**Чорныя простыя шашкі:** 8, 10, 11, 17, 21, 35, 39, 44 (8)

**№ 77**

**Белыя простыя шашкі:** 17, 19, 21, 22, 27, 28, 29, 34, 39 (9)
**Чорныя простыя шашкі:** 8, 13, 18, 26, 40, 41, 42, 45 (8)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні: Выпуск № 74 ад 26.10.2018.

№ 71 1... 2430 2. 3423 2228 3. 3313 0846+

№ 72 f8, g3, g5, b4!, d8, g1+

№ 73 e5, c3, g3, a7+

З лістоў чытачоў: «Прыгожыя, вытанчаныя камбінацыі», — піша У. Панько. «Дзякуй за рубрыку «Шашкі», — выказвае падзяку У. Статкевіч. Дакладныя адказы даслалі В. Дударэвіч (в. Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей (Мядзел), У. Статкевіч (п. Зялёны Бор Івацэвіцкага раёна), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцьвінаў (усе — Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён), У. Бандарык (Мінскі раён).

**Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск, e-mail: info@zviazda.by, або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# Космас пад купалам

**На «Мінск-Арэне» пачаўся мантаж сцэны міжнароднага дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2018».**

Тэхнічная каманда Белтэлерадыёкампаніі ўстанаўлівае дэкарацыі, светлавое і гукавое абсталяванне для маштабнага шоу, фінал якога пройдзе 25 лістапада. Паводле задумы арганізатараў, дзіцячае «Еўрабачанне» будзе мець дзве сцэны: вялікую і малую, звязаныя паміж сабой мостам, а доўгія подыумы цераз танцпляцоўку будуць праходзіць у глядзельную залу. Прэс-цэнтр, індывідуальныя грымёркі ўдзельнікаў і агульны хол прафесіяналы стылізуюць пад зорнае неба (нагадаем, сёлета міжнародны творчы форум пройдзе пад дэвізам Light Up! — «Запальвай!»), купал арэны аформяць шмат'яруснымі святлодыёднымі жырандолямі, а грынрум будзе нібыта «лунаць» у гэтым небе.

Бліжэй да конкурсу — а за тыдзень да фіналу ў нашу краіну прыедуць 19 дэлегацый з іншых краін-удзельніц — у спартыўна-забаўляльным комплексе вырасце цэлы горад, або, як гавораць у дырэкцыі шоу, «сонечная сістэма дзіцячага «Еўрабачання».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**




Тэлесеткі

# НІЧОГА ЛІШНЯГА

Гэты праект тэлеканал АНТ ананасаваў больш як паўгода таму, але толькі ў лістападзе ён даспеў да эфіру. Ужо на гэтым тыдні кіраўнік канала Марат Маркаў прадставіў прэм'еру — аўтарскую праграму ў фармаце вялікіх інтэрв'ю: топ-персоны ў розных сферах, у тым ліку ключавыя фігуры беларускай і замежнай палітыкі, злабадзённыя тэмы, незвычайныя дэкарацыі і ўласная адказнасць за якасць і праўдзівасць той інфармацыі, якую атрымаюць гледачы.



«Калі людзі будуць гаварыць толькі тое, што сапраўды ведаюць, на зямлі стане надзіва ціха. Гэты пасыл і стаў ідэалагічным базісам майго новага праекта «Маркаў. Нічога асабістага», — сцісла пераказвае аўтар і вядучы змест праграмы. На канале дадаюць, што выходзіць яна будзе не толькі строга па чацвяргах, а ў залежнасці ад інфармацыйнай насычанасці тыдня, магчыма, і пазапланава.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# КІНО З ІМЕМ



**«Зямля Саннікава»**
**«Беларусь 3», 12 лістапада**

Схаваную сярод арктычных ільдоў зямлю многія лічылі міфам. Палітычны ссыльны Ілын у кампаніі некалькіх авантурыстаў пры фінансавай падтрымцы багатага прамыслоўца знайшоў гэты загадкавы край, аднак высветлілася, што той неўзабаве будзе знішчаны землятрусам. Ці ўдасца экспедыцыі дасягнуць мацерыка і папярэдзіць катастрофу?..

Раману Уладзіміра Обручава, які стаў асновай савецкага прыгодніцкага фэнтэзі, ужо больш чым 90 гадоў, фільму — 45. А глядзіцца ён нават сёння — на адным дыханні.

**«Фурцава. Легенда пра Кацярыну»**
**АНТ, з 12 лістапада**



Ткачыха з Цвярской губерні Кацярына Фурцава прайшла няпросты шлях — ад апантанай камсамолкі да адной з самых уплывовых жанчын Савецкага Саюза, члена Прэзідыума ЦК КПСС і міністра культуры. Яна перажыла крамлёўскія інтрыгі і разлад у сям'і, кар'ерны ўзлёт і здрадніцтва блізкіх. Пры ёй першую прэмію конкурсу імя Чайкоўскага атрымаў піяніст Ван Кліберн, а Маскоўскі кінафестываль схіліўся перад Федэрыка Феліні, адкрыўся цырк на праспекце Вернадскага і дайшла да гледача «Каўказская палонніца»...



**«Загадкавая гісторыя Бенджаміна Батана»**
**TV1000, 13—14 і 17 лістапада**

Галоўны герой нарадзіўся... ва ўзросце 80 гадоў. Усе былі ўпэўненыя, што хлопчык неўзабаве памрэ, але ён пачаў маладзець, насуперак законам біялогіі. Шлях Бенджаміна Батана пачаўся ў 1918-м у Новым Арлеане і быў поўны самых розных драматычных падзей, ён сустрэў сваё каханне, аднак не здолеў спыніць час, таму перамотаў сваю ўласную стужку жыцця ў адваротным парадку да самага канца.

**«Ральф»**
**«Беларусь 2», 17 лістапада**



Ральф — другасны персанаж васьмібітнай камп'ютарнай гульні, які ўжо 30 гадоў жыве ў гульнявым аўтамаце і разбурае бясконцую будоўлю майстра на ўсе рукі Фелікса. Але аднойчы яму надакучыла быць недалёкім ліхадзеем — і ён збег у іншыя аркадныя гульні, каб даказаць, што таксама можа быць героем. Ральф прымярае на сябе чужыя ролі ў гонцы за ўзнагародамі, але ў рэшце рэшт аказваецца там жа, дзе пачынаў свой шлях, — праўда, ужо ў іншым статусе.



**«Вікторыя»**
**«МІР», 18 лістапада**

Серыял расказвае пра раннія гады праўлення брытанскай каралевы Вікторыі, ад моманту яе ўзыходжання на трон у 18-гадовым узросце да шлюбу з прынцам Альбертам (дарэчы, шлюбы іх дзевяцярых дзяцей з прадстаўнікамі каралеўскіх родаў іншых краін прынеслі Вікторыі неафіцыйны статус «бабулі ўсёй Еўропы»). Стваральнікі чарговага баёпіка відовішчна, пераканаўча і разам з тым даволі дакладна з гістарычнага пункту гледжання перадаюць падзеі знакамітай Віктарыянскай эпохі.




# Не кідай сеянку ў сажалку

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**се́янка** (адно са знач.) — насенне, клубні, прызначаныя для пасеву;

**са́жалка** — штучны вадаём;

**гартава́ць** — надаваць цвёрдасць металу;

**дзірване́ць** — зарастаць травой;

**клі́вы** — той, які любіць насміхацца;

**прына́дны** — прывабны, спакуслівы;

**тачыць лясы** — займацца пустымі размовамі, пустаслоўе (беларускія адпаведнікі: *ліць ваду, малоць языком*; руская: *разводить тары-бары, толочь воду в ступе);*

**на скрут галавы** — 1) вельмі хутка, імкліва бегчы, уцякаць і да т. п.; 2) не думаючы, неабачліва нешта рабіць (беларусы яшчэ скажуць: *без аглядкі, без памяці;* руская: *во все лопатки, с кондачка).*

**Паўторы выпускаў тэлевіктарыны — у ранішнім эфіры «Беларусь 3» кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Беларусь 1

6.20 «Існасць».
**6.45 Меладрама «Трое ў ліфце, калі не лічыць сабаку» (12+).**
8.25 «Кулінарная дыпламатыя» (12+).
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Маршрут пабудаваны». Слуцк (12+).
9.50 «Здароўе» (12+).
10.45 «Жанчыны і спорт».
11.20 «Пад ключ» (12+).
12.10 «50 рэцэптаў першага» (12+).
**12.50 Меладрама «Жанчына з лілеямі» (16+).**
15.15 «Краіна».
**15.45 Меладрама «Як змучыць палюбоўніцу за 7 дзён» (16+).**
20.00 «Макаёнка, 9».
21.00 «Панарама».
**21.45 Меладрама «Справа суддзі Карэлінай» (16+).**
1.20 «Дзень спорту».

## Беларусь 2

7.00 М/ф «Усё пра Розі» (0+).
7.35 «Калі мы дома-2». Скетчкам (16+).
8.35, 21.55 «Тэлебарометр».
8.40 Анімацыйны фільм «Ральф» (12+).
10.25, 0.25 «Хто я?» (12+).
10.45 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
11.25 «Капейка ў капейку» (12+).
12.00 «Спатканне з будучыняй» (16+).
13.00 «Блізняты» (16+).
14.00 «Вясельны памер» (16+).
15.00 «Абмен жонкамі» (16+).
**16.10 Меладрама «Прапанова» (12+).**
**18.00 Фэнтэзі «Прылады смерці: горад касцей» (16+).**
20.10 «Вяселле ўслепую» (16+).
22.00 «Спортлато 6 з 49», КЕНО.
**22.05 Баявік «Новы чалавек-павук: высокае напружанне» (12+).**

## Беларусь 3

7.35 «Сіла веры».
8.00, 15.00, 20.15 Навіны культуры.
8.20, 15.15, 20.30 «Гэты дзень».
**8.25 «Упершыню замужам». Маст. фільм (12+).**
10.00 «Жывая культура». Традыцыйная страва «Клёцкі з душамі» (Браслаўскі раён, Віцебская вобласць).
10.25 «Беларуская кухня». Печаная капуста.
10.55 «Я хачу гэта ўбачыць!» Рака Прыпяць. Частка 1-я (6+).
11.25 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**11.50 «Лёс рэзідэнта». Дэтэктыў (12+).**
14.30 «Навукаманія» (6+).
15.20 М/ф (0+).
**15.45 «Залатая міна». Маст. фільм (12+).**
18.05 «Легенды кіно». Леанід Гайдай (12+).
**18.30 «У бой ідуць адны «старыя». Драма (12+).**
20.00 «Суразмоўцы».
20.40 «Калыханка» (0+).
**21.05 «Сварка ў Лукашах». Камедыя (12+).**
22.35 «Вялікія мастакі». Каміль Пісаро (12+).

## Беларусь 5

7.00 Валейбол. Чэмпіянат Расіі. Жанчыны. «Дынама-Казань» — «Мінчанка» (Мінск).
8.40 Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
9.10 Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Аўтамабіліст» (Екацярынбург).
11.05 Фактар сілы.
11.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
12.05 Вялікі спорт.
12.50 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Маладзечна) — «Шахцёр» (Салігорск).
15.15 Трэніровачны дзень.
15.50 Футбол. Кубак Беларусі. 1/8 фіналу. БАТЭ (Барысаў) — ФК «Гарадзея». (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
17.50 Баскетбол. Кваліфікацыя да Еўра-2019. Жанчыны. Эстонія — Беларусь. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
19.45 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Віве» (Польшча) — БГК імя Мяшкова (Беларусь). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
21.30 Настольны тэніс. Belarus Open — 2018.

## АНТ

7.00, 9.00, 16.00 (з субцітрамі) Нашы навіны.
7.10 «Іграй, гармонік любы!» (6+).
8.00 «Эльдар Разанаў. «Увесь гумар я патраціў на кіно» (12+).
9.10 «Маркаў. Нічога асабістага».
9.40 «Ідэальны рамонт» (12+).
10.35 «Вакол смеху» (12+).
**12.20 Маст. фільм «Цуд» (12+).**
14.45, 16.20 «Талент краіны» (6+).
17.20 «Хто хоча стаць мільянерам?» (12+).
18.20 «Эксклюзіў» (12+).
20.00 «Нашы навіны». Суботні выпуск.
20.45 «Метэагід».
21.05 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
21.10 «Сёння вечарам» (16+).
**23.00 Баявік «16 кварталаў» (12+).**

## СТБ

6.15 «Анфас».
6.35 «Ежа багоў» (16+).
7.25 «Самая карысная праграма» (16+).
8.15 «Тайны Беларусі» (16+).
9.10 «Мінтранс» (16+).
10.00 «Мінск і мінчане».
10.35 «Вялікі горад».
**11.10, 13.40, 16.40 «Фарца». Серыял (16+).**
13.30, 16.30, 19.30 Навіны «24 гадзіны».
20.00 «СТБ-спорт».
**20.10 «Дыверсанты». Серыял (16+).**
23.20 «Дакументальны спецпраект» (16+).
0.20 «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).

## МІР

6.00 М/ф (0+).
6.15 «Мільён пытанняў пра прыроду» (6+).
6.30 «Саюзнікі» (12+).
7.05 «Такія дзіўныя» (16+).
7.35 «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).
**8.05, 4.45 Маст. фільм «Пунсовыя ветразі» (12+).**
10.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 «Як у рэстаране» (12+).
— Упершыню з такім пытаннем супрацоўнікі нашага камітэта сутыкнуліся падчас правядзення праверкі аднаго з магазінаў Пухавіцкага раёна, дзе былі выяўлены факты рэалізацыі прадукцыі са скончаным тэрмінам прыдатнасці. Прадаўцы нам пачалі тлумачыць, што за дадзенае парушэнне ім ужо «выпісалі» штраф. Мы зацікавіліся, як так, бо запісаў у кнізе ўліку праверак ва ўказаны дзень не было. Аказалася, па расказах персаналу, у магазін прыйшлі дзве жанчыны і пачалі правяраць тавар. Вывернулі халадзільнікі з мяснымі прадуктамі і выявілі пратэрміноўку. Пасля гэтага выпісалі штраф і паказалі нумар рахунку, на які трэба заплаціць. Супрацоўнікі ўспрымалі тое, што адбывалася, як праверку, а суму, якая падлягае аплаце, — як наступствы выяўленых парушэнняў. І толькі потым стала зразумела, што грошы, якія кожны заплаціў, — гэта не штраф, а кошт вучобы ў адным з ТАА... Дарэчы, работнікам сказалі, што наведваць занняткі не абавязкова, галоўнае — пералічыць грошы. Замест прамой прапановы набыць паслугу (наведаць адукацыйныя курсы) названыя асобы ўводзілі спажыўцоў у зман.

Пра аналагічныя факты нам таксама расказалі ў пасёлках Свіслач, Рудзенск, Маладзечанскім раёне. Гандлёвыя аб'екты наведвалі (з нарыхтаванымі бланкамі дагавораў) і звычайныя на выгляд «пакупнікі», і прадстаўнічыя мужчыны на дарагім аўтамабілі з пасведчаннямі чырвонага колеру. Якія, дарэчы, шкада, што ніхто не здагадаўся сфатаграфаваць на смартфон... Інфармацыя пра такі від дзейнасці была накіравана ў органы ўнутраных спраў і пракуратуру вобласці.

ПРАБЛЕМА

# АСЦЯРОЖНА: ЛЕКІ З ІНТЭРНЭТУ,

## або Як магіляўчанін дапамог выкрыць махінацыі з медыцынскімі прэпаратамі



Фота Андрэя САЗОНАВА

**Сёлета пад забарону ў Беларусі трапіла некалькі сайтаў, на якіх гандлявалі лекамі. Рашэнні аб абмежаванні іх дзеяння прыняло Міністэрства інфармацыі. Але пасадзейнічаў гэтаму магіляўчанін Сяргей Іваноў.**

— Калі я ўбачыў у інтэрнэце артыкул, што шмат беларускіх рэўматолагаў маюць дачыненне да махінацый з цэлым шэрагам вядомых нам лекаў, у той час як існуе адзіны сапраўды дзейсны прэпарат, адразу ж зразумеў, што гэта падман, — расказвае ён. — Стала вельмі крыўдна за нашых пенсіянераў і інвалідаў, якія могуць трапіць на кручок гэтых махляроў. Бо выглядае інфармацыя вельмі пераканаўча.

А каб не быць галаслоўным, Сяргей вырашыў праверыць усё на сабе. Па спасылцы перайшоў на сайт, які рэкламаваў тыя самыя цудадзейныя лекі, і адразу ж трапіў у атмасферу небывалага ажыятажу. Паведамленне, што засталося ўсяго сем адзінак лекавага сродку суправаджалася адлікам секундаў на анлайн-таймеры. Маўляў, чаго думаеш, хапай хутчэй!

— Я пашукаў вачамі тэлефон, але не знайшоў і паслаў электронную заяўку, — кажа суразмоўнік. — Пакуль чакаў адказу, лічбы на таймеры абнуліліся і колькасць тавару нечакана ўзрасла з сямі да 38. Вось табе і штучна зроблены ажыятаж. Мужчына, які перазваніў, пацікавіўся, колькі мне гадоў, што турбуе, каму заказваю прэпарат. Я паспрабаваў даведацца нешта пра яго, але ён толькі паведаміў, што тэлефануе з Масквы. На просьбу даслаць мне толькі адну ўпакоўку лекаў па акцыйнай цане за сем беларускіх рублёў запярэчыў: прадаём толькі оптам на ўвесь курс лячэння. Пры гэтым па акцыі можна ўзяць толькі адну ўпакоўку, астатнія — па 58 рублёў. Але я заняў прынцыповую пазіцыю і суразмоўнік здаўся. Аднак, калі прыйшла пасылка, высветлілася, што я павінен аддаць 150 беларускіх рублёў. Я адмовіўся яе забіраць.

Між тым пільнаму магіляўчаніну трапіў на вочы ў інтэрнэце яшчэ адзін падазроны артыкул, дзе прапаноўвалі лекі ад гіпертаніі. Падыход быў той жа: выкрыванне прагных медыкаў і лёгкае вырашэнне пытання. Медыцынскі спецыяліст высокага рангу ў галіне кардыялогіі заклікала жыхароў купляць найноўшы прэпарат для лячэння ціску — усяго за пяць рублёў.

На гэты раз Сяргей Іваноў не стаў эксперыментаваць — адразу ж напісаў ліст на імя генеральнага пракурора Беларусі. І зрабіў спасылкі на падазроныя сайты, каб праваахоўнікі разабраліся ў гэтых цёмных гісторыях.

На працягу месяца ён атрымаў аж некалькі адказаў — з Генеральнай пракуратуры, Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, Міністэрства інфармацыі і Міністэрства аховы здароўя. З апошняй інстанцыі нават некалькі. У адным з лістоў паведамлялася, што прэпарат з указанай заяўнікам назвай не зарэгістраваны Міністэрствам аховы здароўя Беларусі ні як лекавы сродак, ні як выраб медыцынскага прызначэння і не ўнесены ні ў Дзяржаўны рэестр лекавых сродкаў, ні ў Дзяржрэестр вырабаў медпрызначэння і медтэхнікі Рэспублікі Беларусь. Яго няма і ў адмысловай электроннай базе даных Нарматыўна-даведачнай інфармацыі Еўразійскай эканамічнай камісіі.

Яшчэ ў адным лісце з Міністэрства аховы здароўя гаворыцца пра тое, што ўсё, пачынаючы ад «указаў», назваў медыцынскіх устаноў і заканчваючы дырэктарамі, урачамі і прафесарамі, прыведзенымі ў рэкламных тэкстах, ад пачатку да канца — хлусня. Нічога з гэтага ў рэальнасці не існуе. Тут жа паведамляецца, што Міністэрства рэгулярна маніторыць інтэрнэт-прастору на прадмет выяўлення ў ёй вось такіх ілжывых паведамленняў і адсылае іх у Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю для прыняцця адпаведных мер. Але ўладальнікі інтэрнэт-сайтаў, дзе рэкламаваліся цудадзейныя сродкі, не з'яўляюцца суб'ектамі гаспадарання Беларусі, таму іх цяжка было знайсці. І міністэрства выказала Іванову падзяку за яго неабыякавую грамадзянскую пазіцыю.

У лісце з Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, у сваю чаргу, паведамілі, што ў тэндэнцыйных артыкулах груба парушаліся нормы Закона Рэспублікі Беларусь «Аб рэкламе» і Міністэрству інфармацыі была накіравана інфармацыя, каб абмежаваць дзейнасць вышэйзначаных сайтаў.

На жаль, пра тое, што паклёпніка, які ўсю гэтую гісторыю заварыў, затрымалі, нідзе не гаворыцца. Напэўна, праваахоўнікі дзвюх краін яшчэ не прапрацавалі гэтае пытанне. Таму трэба быць пільнымі. Для цікавасці паспрабавала паглядзець, наколькі цяпер цуда-лекі даступныя ў інтэрнэце. Напісала назву ў пошукавік і была ўражана, як шмат інфармацыі. Пазыўныя, як той казаў, змяніліся, але бізнес квітнее. Гэтыя назвы, як пустазелле, засмецілі сабой інтэрнэт і вынішчыць іх адтуль цалкам, напэўна, ужо немагчыма.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

### КАМПЕТЭНТНА

**Ірына МАЛЁВАНАЯ, намеснік галоўнага ўрача Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы,** адзначае, што адзіны паратунак ад падманаў — па лекі звяртацца не ў інтэрнэт, а ў аптэкі:

— Любы медык скажа вам, што шукаць медпрэпараты ў інтэрнэце шкодна не толькі для вашага кашалька, але і для здароўя. Не існуе таблеткі ад усяго. Не існуе прэпарату, які за некалькі прыёмаў пазбавяць вас ад хранічнай паталогіі. Хвароба таму і называецца хранічнай, што цалкам амаль не вылечваецца, і задача ўрача забяспечыць нармальнае жыццё чалавека, зняць вострыя праяўленні захворвання. Лекі павінны прадавацца толькі ў аптэках і прызначацца выключна ўрачом. Нават калі яны без рэцэпта, усё роўна правільна будзе спачатку пракансультавацца са спецыялістам. Вельмі шкада, што грамадзяне даваяраюць інтэрнэт-махлярам і аддаюць апошнія грошы за «пустышкі» ў прыгожых абгортках у надзеі на цуд. Але цудаў, на жаль, не бывае. Здаровы лад жыцця, фізічная актыўнасць і збалансаванае харчаванне — гэта асноўны шматвяковы пастулат здароўя. А таблетка існуе толькі для купіравання нейкага крытычнага стану.


**Открытый аукцион № 58/18 по продаже здания магазина по адресу: г. Бобруйск, ул. Максима Горького, д. 41**

| Организатор аукциона | ООО «Реалконсалтинг», адрес: ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8, г. Минск, 220015, Республика Беларусь, телефон/факс + 375 (17) 256-61-35 | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Аукцион состоится 11.12.2018 в 11.00, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701.** Продавец – ООО «Лемон Скай» | | | | | |
| **№ лота** | **Предмет аукциона** | **Местонахождение** | **Площадь, кв. м** | **Начальная цена продажи лота, долл. США** | **Сумма задатка по лоту, руб.** |
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-2737, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000006000315 площадью 0,1155 га (назначение – здание магазина «Наш дом», наименование – здание магазина «Наш дом») | Могилевская обл., **г. Бобруйск**, ул. Максима Горького, д. 41 | **1799,3** | **750 000** | 80 000 руб. |
| * расчеты за приобретаемое имущество производятся в белорусских рублях по курсу НБ РБ на дату заключения договора купли-продажи | | | | | |
| Порядок проведения и выбора победителя | Открытый аукцион на повышение начальной цены проводится с шагом аукциона в размере **5 процентов** от начальной стоимости предмета аукциона. Победителем объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае когда в аукционе примет участие один участник либо на аукцион явится один участник (далее – единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, с его согласия | | | | |
| Прием заявлений | Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 18.00, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. **Последний день приема заявлений: 07.12.2018 до 17.00** | | | | |
| Задаток | Для участия в аукционе необходимо внести задаток (задатки) в вышеуказанном размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких лотов – задаток вносится для каждого из предметов аукциона). Банковские реквизиты:<br>– для резидентов РБ задаток перечисляется в белорусских рублях Организатору аукциона на расчетный счет BY70SLAN30124358100130000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22;<br>– для нерезидентов РБ задаток перечисляется в валютном эквиваленте по курсу НБ РБ на дату платежа на следующие счета: в долларах США (USD) – расчетный счет BY28SLAN30124358150210000000 в ЗАО Банк ВТБ (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22.<br>Получатель платежа: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068.<br>Назначение платежа: «Задаток согласно Извещению о проведении аукциона № 58/18 по лоту № 1» | | | | |
| Затраты | Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником) по фактическим затратам, определенным в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона № 58/18. Победитель аукциона (единственный участник) обязан перечислить на текущий (расчетный) счет Организатора сумму затрат на организацию и проведение аукциона в белорусских рублях в течение 3 рабочих дней со дня его проведения | | | | |

1. Участнику, выигравшему аукцион, и единственному участнику сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключенному по результатам аукциона.
Участникам, не выигравшим аукцион, единственному участнику, не согласившемуся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
2. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона.
3. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 10 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 20 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке

**КОНТАКТНАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОРГАНИЗАТОРА АУКЦИОНА:+ 375 (17) 256-61-35 |• + 375 (25) 549-86-22 – Игорь Садливский • auction@expertiza.by**
**Более подробную информацию и фото по объекту возможно увидеть, посетив страницу: http://www.expertiza.by**



**РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Промагролизинг» (продавец)**

**Лот № 1.** Магазин «Универсам «Сельмашевский», инв. № 350/С-55967. Назначение: здание специализированное розничной торговли. Площадь – 4079,0 кв. м. Количество этажей – 2. Составные части и принадлежности: две кирпичные пристройки. Местонахождение: Гомельская область, г. Гомель, ул. Дворникова, 7. **Начальная цена** с НДС – 2 600 000,00 бел. руб. **Задаток** – 130 000,00 бел. руб. **Шаг аукциона** – 10 000,00 бел. руб. **Земельный участок** площадь 0,6205 га, кадастровый номер 340100000003000069.
**Аукцион состоится 21.11.2018 в 12.00. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23.**
Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже магазина ОАО «Промагролизинг», проводимом 21.11.2018 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 7. **Окончание приема заявлений:** 19.11.2018 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта: Славщик Наталья Владимировна, тел. (044) 581-88-90.
Первое полное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 27.07.2018

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



В связи с утерей свидетельства индивидуального предпринимателя на имя Рубенчик Юлии Анатольевны УНП 101368413 **считать недействительным.**

ТРАПНАЕ ПЫТАННЕ

# Як пазбегнуць жыллёвай пасткі?

## Жыхары гарадскога пасёлка Астрына скардзяцца на высокі ўзровень арэнднай платы



**З такой праблемай сутыкнуліся былыя работнікі мясцовай гаспадаркі ў Шчучынскім раёне. У свой час яны атрымалі жыллё, якое належала ці будавалася калгасам. Прыватызаваць яго жыхары не спяшаліся, бо арэндная плата была невысокая і, як той казаў, «па кішэні». Але з гэтага года кошт арэнды пачаў хутка расці, літаральна за некалькі месяцаў павялічыўся ў тры-чатыры разы. Праблему арандатараў разгледзелі ў Камітэце дзяржкантролю Гродзенскай вобласці.**

У так званую жыллёвую пастку трапіла і сям'я Валянціны Курачкі, якая жыве на вуліцы Першамайскай у гарадскім пасёлку Астрына. Жанчына не думала, што трапіць у такую сітуацыю. Дом ад калгаса сям'я атрымала 20 гадоў таму. Тады толькі пачалі будаваць жыллё па прэзідэнцкай праграме для работнікаў сельскай гаспадаркі. Каб атрымаць кватэру, патрэбен быў стаж работы не менш за 10 гадоў. У мужа Валянціны Іванаўны стаж быў нават большы, да таго ж ён лічыўся добрым работнікам, таму ім далі жыллё ў ліку першых. Муж працягваў працаваць, але пачаліся праблемы са здароўем, і ён мусіў звольніцца.

Не аднойчы сям'я ўздымала пытанне аб прыватызацыі кватэры. Па словах жанчыны, яна тры разы насіла заяву ў праўленне мясцовай гаспадаркі. І кожны раз заяву не прымалі. Маўляў, муж тады звольніцца з калгаса, а работнікаў і так не хапае. Толькі ў 2015 годзе ў гаспадарцы далі дазвол на выкуп кватэры, але налічылі за яе на старыя грошы 500 мільёнаў рублёў, якія сям'я павінна была выплаціць за тры гады. Такі расклад быў непад'ёмны.

— Нам вельмі крыўдна, што проста слёзы цякуць, — скардзіцца жанчына. — Муж амаль 30 гадоў працаваў у калгасе, не піў, не аднойчы яго імя заносілі на дошку гонару. Гаспадарка магла пайсці насустрач і дазволіць растэрміноўку на 10 гадоў, гэта ўдвая менш, чым для работнікаў калгаса. Мы ўклалі нямала сродкаў у гэту кватэру. Правялі газ за ўласныя грошы, паставілі новыя вокны і дзверы, рамантуем жыллё. Гаспадарка, як уласнік, нічога не робіць, а па сценах пайшлі трэшчыны, у падвале вада стаіць. Нам кажуць — рабіце ўсё самі.

Жанчына ў роспачы. А тут яшчэ арэнда стала расці. Калі напачатку яна складала 10 капеек за квадратны метр, то зараз падскочыла да 1 рубля 20 капеек. Цяпер толькі арэнда кватэры складае каля 120 рублёў, кажа Валянціна Іванаўна. А яшчэ амаль столькі ж прыйдзецца плаціць у зімовы перыяд за камунальныя паслугі.

У такой пастцы апынуліся тыя, хто жыве ў ведамасных дамах, але звольніўся з калгаса. Зараз гэта акцыянернае таварыства, у склад якога ўваходзяць тры былыя СВК. Належыць новае фарміраванне Гродзенскай будаўнічай арганізацыі. Па словах Валянціны Іванаўны, у гаспадарцы востра стаіць праблема кадраў, таму кіраўніцтва прымае меры, каб прыцягнуць работнікаў. Адной з такіх мер стала жыллё.

Так, арэндная плата для работнікаў прадпрыемства складае ад 40 да 46 капеек за «квадрат» добраўпарадкаванага жылля і 15 капеек — за жыллё без выгод, дзе няма газу, водаправода, каналізацыі і цеплазабеспячэння. Хто не працуе ў гаспадарцы, плаціць 1 рубель 20 капеек за такую ж плошчу ў абодвух выпадках. Для сваіх работнікаў розніцу кампенсуе само прадпрыемства.

У Камітэце дзяржкантролю Гродзенскай вобласці палічылі такія ўмовы не зусім справядлівымі. Па словах **старшыні КГК вобласці Анатоля ДАРОЖКІ,** жыхары, якія жывуць у адным доме і карыстаюцца аналагічнымі памяшканнямі, пастаўлены ў няроўныя ўмовы толькі таму, што адны працуюць у таварыстве, а іншыя — не.

Таму КГК прапанаваў уласнікам дамоў і раённым уладам перагледзець існуючую арэндную плату з улікам затрат і ступені добраўпарадкавання жыллёвага фонду. Уласнікі да прапаноў прыслухаліся і часткова змянілі свае рашэнні. Для тых, хто пражывае ў дамах без выгод, арэнда з 1 снежня будзе зніжана ўдвая — да 60 капеек за «квадрат».

На думку Віктара Намейкі, які пражывае ў адным з такіх дамоў без выгод, гэта істотнае паслабленне. Асабліва, калі ўлічваць заробкі ў сельскай мясцовасці. Мужчына жыве ў арэндным доме, які атрымаў падчас работы ў калгасе. З прыватызацыяй не спяшаўся, бо плата за кватэру без выгод была сімвалічная. Да таго ж іншыя жыхары дома не ішлі на гэты працэс. У доме, якому гадоў пад сто, у свой час размяшчаліся розныя ўстановы, у тым ліку школа і дзіцячы сад, а потым яго перабудавалі пад жыллё. Чаму прыходзіцца разлічвацца за арэнду нараўне з тымі, хто жыве ў адносна новых тыпавых дамах? Гэта пытанне мужчына не раз задаваў старшыні гаспадаркі. У адказ чуў тое, што і Валянціна Іванаўна. Маўляў, гаспадарцы патрэбны кадры, у асноўным мужчыны. Вось і шукае кіраўніцтва спосабы, каб прыцягнуць работнікаў...

Тыя, хто працуе ў сельгаспрадпрыемстве, маюць правы і на больш прывабныя ўмовы прыватызацыі. Напрыклад, растэрміноўка плацяжу на 20 гадоў, значна меншыя сумы ўнёскаў, дагавор толькі з гаспадаркай, без крэдыту. Такія ўмовы прапануюць і сям'і Валянціны Іванаўны, калі яе муж вернецца ў гаспадарку.

— Нам так і кажуць: прыйдзе на работу, усё зменіцца. І арэнда знізіцца, і прыватызацыя будзе льготнай. А як ён вернецца? Усё, што ён змог, ён аддаў калгасу, столькі гадоў працаваў. Зараз таксама дома не сядзіць, працуе электрыкам, але ў іншай арганізацыі.

Валянціна Іванаўна ўзважвае свае шанцы на прыватызацыю. Гэты шлях ёй падаецца найбольш спрыяльным, хоць яна і не чакае паслаблення. Бо ім арэндную плату не знізілі — наадварот, яна будзе толькі расці. На жаль, у расклад не бярэцца такая важная акалічнасць, як тое, што сям'я шматдзетная. Жанчына з мужам выхоўваюць траіх прыёмных дзяцей, малодшаму з якіх — 4 гады.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**Вольга КУРЧЫЦКАЯ, начальнік аддзела ЖКГ і будаўніцтва КДК Гродзенскай вобласці:**

— Жыллё належыць ААТ «Агра ГЖС». Гаспадарка мае праблему з кадрамі. Тут патрэбны спецыялісты розных профіляў — ад механізатараў да жывёлаводаў. Але людзі не ідуць, таму таварыства і карыстаецца такімі непапулярнымі метадамі ўздзеяння, каб прыцягнуць жыхароў арэндных дамоў. А сярод іх ёсць кіроўцы, трактарысты, якія патрэбны ў гаспадарцы. Вядома, уласнікі будавалі жыллё для сваіх работнікаў і маюць права ім распараджацца, у тым ліку ўстанаўліваць арэндную плату. Яны падлічылі затраты, якія нясуць па яго ўтрыманні, сумы крэдытаў на яго будаўніцтва і разбілі на агульную плошчу арэндных жылых памяшканняў. Атрымалася лічба 1,2 рубля за «квадрат». Для Астрына, я лічу, гэта даволі высокая плата, бо яна дасягае 100 рублёў і больш. Плюс яшчэ камунальныя плацяжы. Трэба разглядаць такія выпадкі ў індывідуальным парадку. Магчыма, у гэтую катэгорыю можа аднесці і шматдзетную сям'ю, у якой выхоўваюцца прыёмныя дзеці.


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1. капитальное строение, инв. № 400/С-79834 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, назначение – здание центрального склада), обшей площадью 888,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 14Д

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 440100000001006837, площадью 0,2244 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания центрального склада), расположенном по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 14Д

Начальная цена продажи – 180 000 руб. (сто восемьдесят тысяч рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 18 000 руб. (восемнадцать тысяч рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Продавец – Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 22 ноября 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 13.07.2018**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 19 ноября 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*



**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении повторного открытого аукциона**

Лот № 1. Пресс пневматический PE-50, инв. № 41787.
**Начальная цена продажи: 108 080,40 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 10 808,04 бел. руб.;**

Лот № 2. Ферментатор EV-346, инв. № 41786.
**Начальная цена продажи: 54 600,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 5 460,00 бел. руб.;**

Лот № 3. Наполнитель огурцов с вибрационной плитой Fenco, инв. № 41610.
**Начальная цена продажи: 92 400,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 9 240,00 бел. руб.;**

Лот № 4. Этикетировочная машина для бутылок XR4T 1S, инв. № 27367.
**Начальная цена продажи: 51 520,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 5 152,00 бел. руб.;**

Лот № 5. Бутыломоечная машина БЗ-АММ-6.
**Начальная цена продажи: 42 210,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 4 221,00 бел. руб.;**

Лоты №№ 6–9. Емкость горизонтальная для нефтепродуктов объемом 50 куб. м.
**Начальная цена продажи каждого лота: 840,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 84,00 руб.;**

Лоты №№ 10–19: Емкость горизонтальная пищевая объемом 50 куб. м.
**Начальная цена продажи каждого лота: 1190,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 119,00 бел. руб.;**

Лоты №№ 20–21: Емкость горизонтальная объемом 60 куб. м.
**Начальная цена продажи каждого лота: 980,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 98,00 бел. руб.;**

Лоты №№ 22–27: Емкость вертикальная пищевая объемом 50 куб. м.
**Начальная цена продажи каждого лота: 840,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 84,00 бел. руб.;**

Лоты №№ 28–31: Емкость вертикальная пищевая объемом 60 куб. м.
**Начальная цена продажи каждого лота: 910,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 91,00 бел. руб.**

Местонахождение объектов: г. Быхов, ул. Красноармейская, 26

| | |
|---|---|
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион состоится 28 ноября 2018 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Последний день подачи заявок и внесения задатка: 27 ноября 2018 года до 15.00. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона |

**Продавец:** ОАО «Быховский консервно-овощесушильный завод», УНП 700183696, Могилевская обл, г. Быхов, ул. Красноармейская, 26

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

| | |
|---|---|
| **Расчетный счет для внесения задатка** | Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X |

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает затраты за организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 04.04.2018, от 19.06.2018

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375222-72-41-14, +37544-767-65-36**

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

# ТЭХНАЛОГІІ ПЕРАПРАЦОЎКІ НАПОЎНІЦУ

## Пагадненне аб замкнутым цыкле абыходжання з адходамі ў Салігорску было падпісана паміж мясцовай уладай і нямецкім вытворцам

**У мінулым нумары мы падрабязна расказалі аб тым, як у Беларусі абыходзяцца з адходамі і як на гэтым можна зарабіць. Пасля яго выхаду стала вядома, што ў справе другаснага ўцягвання ў гаспадарчы абарот Салігорск пайшоў яшчэ далей і заключыў пагадненне з REMONDIS аб стварэнні замкнутага цыкла абыходжання з адходамі.**

Дзякуючы дамове, прадугледжанна стварэнне сумеснага беларуска-нямецкага прадпрыемства, якое арганізуе поўны цыкл абыходжання з адходамі ў горадзе шахцёраў, а таксама на тэрыторыі яго раёна. Такім чынам гэта будзе прыносіць карысць больш чым 120 тысячам чалавек. Разам з аптымізацыяй лагістыкі і абнаўленнем кантэйнернага парка і транспартных сродкаў, вялікая ўвага будзе ўдзелена мадэрнізацыі існуючай сартавальнай установкі, а таксама запуску абсталявання па перапрацоўцы буйнагабарытных, раслінных (зялёных) і будаўнічых (мінеральных) адходаў.




Адпаведны кантракт падпісалі старшыня Салігорскага райвыканкама Алег Паскробка і кіраўнік кампаніі REMONDIS International GmbH Хенрык Фанэгут.

— Працуючы з REMONDIS, Салігорск атрымае адну з самых сучасных сістэм кіравання адходамі ва Усходняй Еўропе, паколькі наш будучы партнёр валодае самымі перадавымі распрацоўкамі ў гэтай галіне, — прыводзіць словы кіраўніка Салігорскага раёна Алега Паскробкі прэс-служба кампаніі.

Генеральны дырэктар REMONDIS Belarus Эрвін Куртбедзінаў упэўнены, што гэтае пагадненне будзе карысна жыхарам горада і цалкам навакольнаму асяроддзю:

— Мы ўпэўнены, што разам з мясцовымі ўладамі Салігорска створым самую сучасную сістэму абыходжання з адходамі.

Цяпер у горадзе шахцёраў працуюць над новай канцэпцыяй стварэння замкнутага цыкла абыходжання з адходамі. Мэтай стварэння сумеснага прадпрыемства ў гэтым кантэксце з'яўляецца збор другасных матэрыяльных рэсурсаў, а таксама істотнае павелічэнне аб'емаў іх перапрацоўкі ў Салігорску. Такім чынам, аб'ем адходаў, якія будзе хавацца на палігоне, значна паменшыцца. Таксама паралельна абмяркоўвалася пытанне стварэння ў найбліжэйшыя гады ў межах дзяржаўна-прыватнага партнёрства сучаснага рэгіянальнага палігона, паведамілі ў кампаніі.

**Наша даведка**

**Кампанія REMONDIS з'яўляецца вядучым міжнародным пастаўшчыком паслуг у сферы перапрацоўкі адходаў, водазабеспячэння і абслугоўвання камунальнай гаспадаркі.**

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# Як вырашыць «смеццевую праблему»

**У кастрычніку спецыялісты Чэрвеньскага раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі правялі маніторынг 205 тэрыторый арганізацый і населеных пунктаў і выявілі парушэнні на 60 з іх. У 19 выпадках назіралі захламленасць, у 28 — утрыманне кантэйнерных пляцовак для збору цвёрдых камунальных адходаў не ў адпаведнасці з санітарна-эпідэміялагічным заканадаўствам, у 16 — іншае. У адрас суб'ектаў гаспадарання накіравалі 32 рэкамендацыі аб ліквідацыі парушэнняў, былі накладзены 5 штрафаў. Аб гэтым «Раённаму весніку» паведаміла Наталля Свядыш, галоўны дзяржаўны ўрач Чэрвеньскага раёна.**



www.cherven.by

Больш за ўсё нараканняў спецыялістаў санітарнай службы выклікае ўтрыманне кантэйнерных пляцовак, якія стаяць на балансе Чэрвеньскай ЖКГ. Напярэдадні Бацькоўскай суботы мясцовыя жыхары актыўна прыбіралі месцы пахаванняў на могілках, што прывяло да нагрувашчвання рытуальных прылад, а таксама апалай лістоты і галінак, бытавога смецця на пляцоўках часовага захоўвання на тэрыторыі могілак ва ўсіх сельсаветах і ў райцэнтры.

— Другая праблема — несанкцыянаваныя звалкі, у тым ліку і на сельскагаспадарчых землях. Кіраўнікі такіх гаспадарак, як ААТ «Запольскае», ААТ «10 з'езд Саветаў», філіял СГК «Вялікаполле» КУП «Мінсктранс», КСУП «Ганута-агра» і іншыя не прымаюць адпаведных мер па іх ліквідацыі, — кажа галоўны санітарны ўрач раёна.

Наталля Свядыш нагадвае, што за выкід смецця ў ненале жным месцы пагражае адміністрацыйная адказнасць: згодна з артыкулам 15.63 КаАП Беларусі, парушэнне заканадаўства аб абыходжанні з адходамі цягне за сабой папярэджанне або накладанне штрафу ў памеры ад 5 да 50 базавых велічынь на фізічную асобу.

Праблема несанкцыянаваных сметнікаў у раёне існуе даўно, адзначае спецыяліст, і адной з прычын, на яе думку, з'яўляецца недасканалая сістэма збору ад насельніцтва цвёрдых камунальных адходаў камунальнай службай раёна. У многіх маланаселеных вёсках адсутнічаюць пляцоўкі і кантэйнеры для збору смецця, што і вымушае жыхароў вывозіць яго ў месцы, для гэтага не прызначаныя.

Замест таго каб памнажаць лік несанкцыянаваных звалак, трэба знайсці спосаб вырашыць праблему. Напрыклад, заключыць дагавор са спецыялізаванай арганізацыяй на вываз смецця, самастойна правозіць яго на палігоны цвёрдых камунальных адходаў або кампаставаць на ўласных участках арганічныя адходы, якія ў далейшым могуць выкарыстоўвацца ў якасці ўгнаенняў для падкормкі глебы. Частка бытавых адходаў (напрыклад, папера, кардон, поліэтылен, пластмаса, шкло, металалом) — гэта другасныя матэрыяльныя рэсурсы. Пры асобным зборы іх можна здаць у прыёмныя пункты.

— Усе гэтыя спосабы збору і ўтылізацыі смецця даўно знайшлі выкарыстанне і эканамічнае абгрунтаванне ў многіх краінах свету. Кожны з нас нясе адказнасць за ахову прыроды і экалагічную бяспеку нашай краіны. Давайце разам пачнём барацьбу за чысціню нашай малой радзімы! — заклікае санітарны ўрач.

ЦІКАВЫ ВОПЫТ

# Капрызныя прынцэсы, вясёлыя акцёры і поліэтыленавыя шэдэўры

## Як нестандартна выкарыстаць другасныя рэсурсы, ведаюць на Гомельшчыне — напрыклад, у якасці дэкарацый і матэрыялаў для сцэнічных касцюмаў

**Па ініцыятыве Хойніцкага ТЦСАН у мясцовым Доме культуры прайшоў VI рэгіянальны фестываль дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Чароўны свет фантазіі» з удзелам маладых інвалідаў, паведамляе газета «Хойніцкія навіны».**



www.hoiniki.by

Гэтым разам канкурсантам прапанавалі прыдумаць дэкарацыі і касцюмы з поліэтылену для свайго выступлення. Кожная каманда пастаралася на славу. У спіс удзельнікаў увайшлі восем раёнаў: Калінкавіцкі, Лельчыцкі, Лоеўскі, Нараўлянскі, Петрыкаўскі, Рэчыцкі, Мазырскі і Хойніцкі.

Асноўная тэма фестывалю — «У гасцях у казкі». Моладзь дэманстравала фрагменты пастановак па матывах казак «Лятучы карабель», «Курачка Раба», басні «Страказа і мураш» і яшчэ некалькіх добра знаёмых мультфільмаў і дзіцячых песень.

Самым хвалюючым момантам свята стала цырымонія ўзнагароджання. Усе каманды атрымалі заслужаныя Падзякі ад арганізатараў за ўдзел. У намінацыі «Тэатральнае мастацтва» трэцяе месца заняў Петрыкаўскі ТЦСАН, другое — Хойніцкі, а пераможцамі сталі акцёры з Рэчыцкага ТЦСАН, якія цудоўна выступілі з урыўкам «Капрызная прынцэса».

У намінацыі «Эстэтычнае афармленне касцюмаў і дэкарацый» на трэцім месцы апынуліся майстры Лельчыцкага ТЦСАН, другое занялі прадстаўнікі Лоеўскага цэнтра, а перамогу святкавалі хайнічане. Іх непаўторная дэкарацыя для пастаноўкі «Беласнежка і сем гномаў» заслужана атрымала прыхільнасць журы і захапленне гледачоў.

За перамогу ў намінацыі «Тэатральнае майстэрства і ўменне працаваць у вобразе» ўзнагародзілі маладых артыстаў Мазырскага ТЦСАН. Прыз жа сімпатый гледачоў атрымала каманда з Калінкавіч.

У фінале свята ўсе яго ўдзельнікі праспявалі разам гімн фестывалю з абяцаннем сустрэцца тут налета.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 8 лістапада 2018 года.**